

# «МАЛАЙЦЫ, ШТО З ЛЮДЗЬМІ ПРАЦУЕЦЕ. ГЭТА ДЛЯ НАС ГАЛОЎНАЕ»

**За што Прэзідэнт удзячны Палаце прадстаўнікоў**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 ВЕРАСНЯ 2025 г. АЎТОРАК № 173 (30561)

АДУКАЦЫЯ

## СТУДЭНЦКАЯ СЯМ'Я ВІТАЕ МАЛАДЫХ

**Ва ўніверсітэтах Беларусі праходзіць «Месяц першакурсніка»**

Пачатак навучальнага года — час, калі першакурснікі становяцца ў цэнтры асаблівай увагі з боку вопытных педагогаў і студэнтаў-валанцёраў, якія цэлы месяц забяспечваюць учарашнім школьнікам поўную інфармацыйную і прававую падтрымку. Як расказалі ў Міністэрстве адукацыі, верасень першакурсніка распісаны літаральна па днях і гадзінах. Акрамя «пар», у іх дзясяткі мерапрыемстваў, што дапамагаюць увайсці ў студэнцкае жыццё і побыт, знайсці сяброў і наладзіць адносіны з іншымі студэнтамі і выкладчыкамі.

СТАР. 10–11



Фота БелТА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.



ЯШЧЭ АДНА ВЯРШЫНЯ САБАЛЕНКІ 12

БЕЛАРУСЬ АДЗІНАЯ

АКЦЫЯ ЗАВІТАЛА Ў МАГІЛЁЎ 5



УБОРАЧНАЯ 2025: ПА ЎСІХ ФРАНТАХ 6

СВЯТОЧНАЕ

## XXXII ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА ПРЫМАЛА СТАРАЖЫТНАЯ ЛІДА

**Як гэта было — на старонках «Звязды»**

Тыя, хто пабываў на XXXII Дні беларускага пісьменства 6 і 7 верасня ў Лідзе, пагодзяцца, што фестываль прайшоў маштабна і падарыў удзельнікам незабыўныя ўражанні, знаёмствы і новыя веды аб культуры і гісторыі роднай краіны. Сёлета рэспубліканскае свята аб'яднала адразу некалькі лейтматываў і было прысвечана 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, Году добраўпарадкавання, а таксама 500-годдзю з моманту выхаду кнігі «Апостал» Францыска Скарыны.

СТАР. 8–9



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

TikTok

ISSN 1990 — 763X

25173>

# «МАЛАЙЦЫ, ШТО З ЛЮДЗЬМІ ПРАЦУЕЦЕ. ГЭТА ДЛЯ НАС ГАЛОЎНАЕ»

## За што Прэзідэнт удзячны Палаце прадстаўнікоў

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Старшыню Палаты прадстаўнікоў Ігара Сергеенку. Галоўная тэма — падрыхтоўка да трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў, якая адкрыецца 16 верасня. Разгледзелі і іншыя пытанні дзейнасці ніжняй палаты парламента.


Фота БелТА.

**«Перадайце дэпутатам маю падзяку і вам за тое, што вы даяце зрэз настрою нашага грамадства. Гэта вельмі важна для мяне, усё ж такі дэпутаты — гэта людзі незалежныя і аб'ектыўныя», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён расказаў, што азнаёміўся ў абагульненым выглядзе з пытаннямі, якія ставяць перад дэпутатамі іх выбаршчыкі. Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што для яго гэта вельмі важна, таму ён даручыў ураду разабрацца дэталёва ў кожным пытанні, прыняць меры і дэпутатам далажыць.**

**«Гэту працу трэба працягваць. Яна для дзяржавы і для мяне вельмі важная», — прызнаўся кіраўнік дзяржавы.**

Сесія Палаты прадстаўнікоў адкрываецца толькі праз тыдзень, дэпутаты ўжо актыўна працуюць над законапраектамі. Прэзідэнт спытаў, як ідзе гэта праца, ці патрэбная дапамога. Аляксандр Лукашэнка спытаўся, якія прынцыповыя законы будуць разглядацца на сесіі.

**«Дзякуй, што парламент спакойна, ціха працуе. Усе ўвайшлі ў каляіну. Праца цікавая, хоць і няпростая, таму што дэпутат — велічыня**

## Даслоўна

### ПАДРЫХТОЎКА ДА ТРЭЦЯЙ СЕСІІ, МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ, РАБОТА З НАСЕЛЬНІЦТВАМ



Некаторыя падрабязнасці свайго дакладу кіраўніку дзяржавы Ігар Сергеенка раскрыў і журналістам. «Сёння ў парламенцкім партфелі знаходзіцца 21 законапраект, асобныя з іх будуць разглядаць ны ў другім чытанні, значная частка — у першым чытанні», — расказаў ён. Законапраекты, якія будуць разглядацца на трэцяй сесіі, датычацца пытанняў абароны, праваахоўнай дзейнасці, сацыяльна-эканамічнага развіцця, міжнароднай дзейнасці. «Усе пытанні разглядаюцца ў профільных камісіях з запрашэннем спецыялістаў, прадстаўнікоў міністэрстваў. У большасці ўсе законапраекты гатовыя да разгляду. Хацеў бы звярнуць увагу, што асноўная праца вядзецца на стадыі разгляду законапраектаў у Авальнай зале — тое, чым сёння займаюцца дэпутаты Палаты прадстаўнікоў», — удакладніў Ігар Сергеенка.

Што датычыцца міжнароднай дзейнасці, то, па словах Старшыні Палаты прадстаўнікоў, акцэнт робіцца на пашырэнні прысутнасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у міждзяржаўных парламенцкіх аб'яднаннях. «Мы атрымалі статус назіральніка ў Панафрыканскім парламенце, у Парламенцкай Азіяцкай Асамблеі. Рыхтуемся атрымаць такі ж статус назіральніка (ёсць адпаведнае запрашэнне) у арабскім парламенце. Актуалізавана работа на новых напрамках. З'явіліся такія краіны, як Інданезія, Бразілія, Алжыр. Акцэнт робім не толькі на паездках, але і на сустрэчах у Мінску, каб пашырыць кола нашых сяброў шляхам фарміравання груп дружбы. Мы працуем на пляцоўцы Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Адзін з найважнейшых кірункаў — праца Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі. Гэта праца па мадэльных законах з акцэнтам на выраўноўванне правоў грамадзян па асобных кірунках, правядзенне розных мерапрыемстваў патрыятычнай накіраванасці», — падкрэсліў Ігар Сергеенка.

Прэзідэнт ацаніў работу Палаты прадстаўнікоў з насельніцтвам. Ігар Сергеенка адзначыў, што ў працэсе працы над законапраектамі вывучаецца не толькі правапрымяняльная практыка, але і грамадскае меркаванне. «За папярэдні год намі праведзена 20 семінараў па канкрэтных напрамках, па канкрэтных тэмах. Мэта гэтых семінараў — прыйсці да адзінай высновы з улікам розных пунктаў гледжання па тым ці іншым законапраекце. Гэта першае. А другое — узбагаціць дэпутатаў інфармацыяй па канкрэтнай праблеме», — распавёў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. У прыклад ён прывёў пытанні, звязаныя з электрыфікацыяй прыватных домаўладанняў, якія часта паднімаюцца на прыёме грамадзян. Каб разумець гэту праблему ў разрэзе кожнага раёна, у Авальнай зале быў праведзены семінар з кіраўніцтвам Міністэрства энергетыкі, абласных структур, якія ўзброілі дэпутатаў ведамі, неабходнымі для працы з выбаршчыкамі.

Яшчэ адзін прыклад — змяненні, унесеныя ў Кодэкс аб адукацыі. Па словах Ігара Сергеенкі, многія змены ішлі менавіта ад адносін з педагагічнай грамадскасцю.

Пункты гледжання спецыялістаў на месцах вывучаліся, і, напрыклад, перад прыняццем Закона аб рэгістрацыі нерухомай маёмасці. «Улічваецца меркаванне спецыялістаў, улічваецца меркаванне грамадзян. І там, дзе мы бачым, што гэта мае права на жыццё, вядома, мы гэта ўлічваем», — рэзюмаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

**сам па сабе, яго абіраюць выбаршчыкі канкрэтныя. Я быў дэпутатам і ведаю, што гэта такое», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.**

Асобна кіраўнік дзяржавы вылучыў работу на міжнародным трэку.

**«Якраз тое, чаго не хапае сёння і нават членам урада. Калі ты паехаў у камандзіроўку, значыць, адтуль трэба нешта прывезці канкрэтнае», — адзначыў ён.**

Па словах беларускага лідара, няхай патрохі, але трэба заходзіць на рынкі іншых краін і адказваць за гэта павінны ўсе вышэйшыя службовыя асобы.

**«У нас няма такіх людзей, якія не маюць дачынення да эканомікі, асабліва сёння да знешняга гандлю. Вы адчуваеце і ведаеце, што гэта самая вялікая праблема сёння ў Беларусі — замясціць той аб'ём, які мы не можам прадаць з-за пэўных аб'ектыўных прычын. У Расійскай Федэрацыі і на трэку далёкай дугі мы павінны ў гэтым плане працаваць», — заявіў кіраўнік дзяржавы.**

На мінулым тыдні Ігар Сергяенка па даручэнні Прэзідэнта з візітам наведаў В'етнам. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэта краіна, якая сёння актыўна развіваецца, нацэлена на супрацоўніцтва з Беларуссю і гэта ўзаемна.

**«З гэтай краінай трэба супрацоўнічаць, змагаліся калісьці разам, ваявалі. У нас ёсць добрая аснова для супрацоўніцтва», — упэўнены беларускі лідар.**

Падсумоўваючы, кіраўнік дзяржавы ацаніў работу Палаты прадстаўнікоў:

**«Палата прадстаўнікоў працуе ціха, спакойна. Але я бачу, малайцы, што з людзьмі працуеце. Гэта для нас галоўнае. Аднак усе павінны ведаць, што ёсць у нас парламент, які займаецца ціха-спакойна сваімі справамі».**

Ігар Сергяенка далажыў аб падрыхтоўцы да трэцяй сесіі.

**«Падчас падрыхтоўкі да гэтай сесіі мы абапіраемся на той багаж, які ў нас быў летась».**

**Валерыя СЦЯЦКО.**

ТЫМ ЧАСАМ

# «ГЭТА ЎСЁ ТРЭБА НАШАЙ ЭКАНОМІЦЫ, НАШАЙ КРАІНЕ, НАШЫМ ЛЮДЗЯМ»

## Наталля Эйсмант падзялілася падрабязнасцямі аб марафоне міжнародных сустрэч Аляксандра Лукашэнкі ў Кітаі

Прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля Эйсмант у інтэрв'ю тэлеканалу «Першы інфармацыйны» падзялілася падрабязнасцямі аб серыі міжнародных сустрэч і перагавораў, якія кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка правёў падчас свайго пяцідзённага рабочага візіту ў Кітай.

### У РЭЖЫМЕ НОН-СТОП



Нагадаем, што Аляксандр Лукашэнка ў Кітаі паўдзельнічаў у саміце Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і прысутнічаў на ўрачыстасцях з нагоды 80-годдзя Перамогі над японскім мілітарызмам і заканчэння Другой сусветнай вайны. Разам з кіраўніком беларускай дзяржавы ў гэтых мерапрыемствах удзельнічалі яшчэ больш як 30 замежных лідараў і кіраўнікоў міжнародных арганізацый, што дало магчымасць правесці шэраг сустрэч і перагавораў у двухбаковым фармаце.

«Адбылася вельмі сур'ёзная сустрэча са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам», — нагадала Наталля Эйсмант.

Нягледзячы на тое, што ў пачатку чэрвеня гэтага года Аляксандр Лукашэнка і Сі Цзіньпін ужо праводзілі ў Пекіне сустрэчу ва ўнікальным сямейным фармаце, цяперашнія перагаворы ў Цяньцзіне, дзе прайшоў саміт ШАС, — гэта была глыбокая і працяглая размова.

**«Інтэнсіўнасць беларуска-кітайскіх адносін такая, што Аляксандру Лукашэнку і Сі Цзіньпіну заўсёды ёсць аб чым пагаварыць. Гэта была найважнейшая сустрэча», — падкрэсліла прэс-сакратар.**

Асобна яна спынілася і на праведзенай праз некалькі дзён сустрэчы з членам Пастаяннага камітэта Палітбюро ЦК Кампартыі Кітая, сакратаром Сакратарыята і кіраўніком Канцылярыі ЦК КПК Цай Ці: «Вельмі глыбокая палітычная сустрэча. Вельмі глыбокая палітычная размова, якая доўжылася практычна гадзіну — сама непасрэдна размова. А потым быў праведзены прыём па даручэнні Старшыні КНР. І падчас гэтага прыёму размова працягнулася. Гаварылі аб вельмі многім, у тым ліку, вядома, і аб эканамічных пытаннях».

Нагадаем, што ў Пекіне таксама адбылася сустрэча з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. І хоць пратакол для СМІ быў кароткім, сама сустрэча была працяглай, падзялілася падрабязнасцямі Наталля Эйсмант. Пачаўшыся крыху пазней за 23 гадзіны па пекінскім часе, сустрэча лідараў краін завяршылася толькі да дзвюх гадзін ночы. І гэта пры тым, што раніцай трэба было выязджаць на ваенны парад. «Гэта самы, на мой погляд, яскравы прыклад, якім на працягу ўсіх гэтых пяці дзён быў рабочы графік у нашага Прэзідэнта», — робіць акцэнт Наталля Эйсмант.

Гаворачы аб сустрэчы з расійскім лідарам, яна адзначыла, што хоць нядаўна прэзідэнты на працягу некалькіх дзён доўга размаўлялі на Валааме, але «Аляксандру Лукашэнку і Уладзіміру Пуціну ў любых абставінах ёсць што абмяркаваць».

### ПРЫЙДЗЕ ЧАС — УСЕ БУДУЦЬ ВЕДАЦЬ

На палях міжнародных мерапрыемстваў у Кітаі было шмат і іншых сустрэч. Многія звярнулі ўвагу на размову Прэзідэнта Беларусі з Прэм'ер-міністрам Індыі Нарэндрам Модзі. Таксама адбыліся кантакты з лідарамі Азербайджана, КНДР, Манголіі, Інданезіі, Узбекістана, Таджыкістана, Зімбабвэ, Конга, Славакіі...

«Я спецыяльна пералічыла ўсё тое, што мы давалі ў СМІ. Але, вядома, гэта не ўсе сустрэчы, не ўсе зносіны. Перагавораў такіх (няхай аператыўных, але сур'ёзных размоў) у Прэзідэнта было значна больш. Аб многім пагаварылі даволі сур'ёзна», — падкрэсліла прэс-сакратар.

Яна таксама звярнула ўвагу на дружалюбны фармат зносін кіраўніка дзяржавы.

**«Наш Прэзідэнт умее сябраваць. Але і прыўнесці ў любыя абставіны такі рабочы фармат, рабочую нотку — гэта таксама яго фішка», — адзначыла Наталля Эйсмант.**

У ходзе візіту ў Кітай таксама адбылася шэраг сустрэч Аляксандра Лукашэнкі з прадстаўнікамі дзелавых колаў КНР, і гэта стала традыцыйным фарматам. Частка перагавораў насіла закрыты характар. «Далёка не ўсё было паказана ў СМІ. Гэтыя сустрэчы ішлі ў рэжыме нон-стоп больш чым паўдня.

Гэта быў марафон, калі адна дэлегацыя выходзіла, іншая адразу ж заходзіла. Вельмі перспектыўныя праекты, гэта ўсё трэба нашай эканоміцы, нашай краіне, нашым людзям. Прыйдзе час, вядома ж, аб гэтым усе будуць ведаць. Проста цяпер крыху ранавата, але сферы ключавыя», — растлумачыла прэс-сакратар.

Адразу ж па выніках кожнай сустрэчы адказныя асобы ў беларускай дэлегацыі атрымлівалі задачы ад Прэзідэнта па сваіх кірунках. Работа над рэалізацыяй дамоўленасцяў ужо вядзецца.

Адказваючы на пытанне аб складанасці і насычанасці прэзідэнцкага графіка і ўсёй дэлегацыі, Наталля Эйсмант падкрэсліла, што пытанне ніколі не стаіць у ключы «складана ці не». «Ёсць мерапрыемства — ёсць задача. І Прэзідэнт ідзе і робіць яе, не думаючы ў гэты момант, складана або проста. Зразумела, што графік вельмі насычаны, трэба кожныя некалькі гадзін пераключацца з фармату на фармат, з тэмы на тэму. Але гэта мэтанакіраваная работа, да якой усе ў гэтых абставінах гатовы», — падкрэсліла яна.

### «ГЭТА БЫЛО МАГУТНА, УРАЖЛІВА»

Наталлю Эйсмант папрасілі падзяліцца атмасферай падчас візіту і рэакцыяй — што гавораць пра Беларусь. «Сапраўды рэакцыя ёсць, рэакцыя сур'ёзная. Мы яе бачым, чуем ужо практычна тыдзень», — сказала яна.

Па выніках саміту было атрымана шмат водгукаў, якія паступалі ў тым ліку непасрэдна прэс-сакратару. Гэта, напрыклад, рэакцыя ад прадстаўнікоў экспертнай супольнасці, і не толькі беларускай. «Людзі ініцыятыўна пішуць, тэлефануюць, выказваюць меркаванні, прапановы», — адзначыла Наталля Эйсмант.

*(Працяг на 4-й стар.)*



# «ГЭТА ЎСЁ ТРЭБА НАШАЙ ЭКАНОМІЦЫ, НАШАЙ КРАІНЕ, НАШЫМ ЛЮДЗЯМ»

Яна не стала даваць свае ацэнкі або падводзіць вынікі, а толькі працытавала водгукі ў цэлым на візіт Аляксандра Лукашэнкі, які адбыўся: «Нашы эксперты, людзі вельмі сур'ёзныя, пісалі так: «Кітай — гэта было магутна, Кітай — гэта было ўражліва». Вось такія ацэнкі прагучалі з боку».

Прэс-сакратар адзначыла, што Беларусь ужо год з'яўляецца паўнавартасным удзельнікам ШАС і за гэты год праведзена вялікая работа:

**«Нашы дэлегацыі, адказныя ведамствы на ўсіх узроўнях бралі ўдзел ва ўсіх сустрэчах, абмеркаваннях, выпрацоўвалі ініцыятывы, самі ініцыявалі абмеркаванне нейкіх пытанняў, нейкія рашэнні і гэтак далей. Праведзеныя саміты ШАС (размова аб пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў ШАС, а таксама аб сустрэчы ў Пекіне ў фармаце «ШАС плюс». — Заўв. рэд.) — гэта кульмінацыя ўсёй гэтай гадавой работы, калі ў максімальна канцэнтраваным выглядзе ўжо кіраўнік дзяржавы з высокай трыбуны агучвае ўсё тое, што мы напрацавалі, і ўсё тое, што мы маем.**

Наталля Эйсмант падкрэсліла, што Беларусь ніколі не з'яўляецца пасіўным удзельнікам ніякіх аб'яднанняў, а Прэзідэнт заўсёды гаворыць тое, што мае сказаць.

**«Мы, вядома, разлічваем на ШАС, для нас гэта вельмі важнае аб'яднанне. Тым не менш Прэзідэнт заўсёды гаворыць абсалютна дакладна, адкрыта аб нейкіх нюансах і шурпатасцях. Яшчэ больш аб задачах кажа. Ну і, вядома, аб тым, што зроблена. Таму ўсе ведаюць, што нашага Прэзідэнта слухаюць уважліва».**

## НАЙЛЕПШАЯ РЭКЛАМА: ПРЭЗІДЭНТ ПАДАРЫЎ ЛІДАРАМ ШАС БЕЛАРУСКУЮ БУЛЬБУ І РАПСАВЫ АЛЕЙ

Аляксандр Лукашэнка падчас візіту ў Кітай для ўдзелу ў саміце Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва прывёз у падарунак лідарам аб'яднання беларускую бульбу і рапсавы алей. Падрабязнасці расказалі ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1».

Разгледзець «сакрэтны груз» беларускага борта нумар адзін журналістам удалося падчас цырымоніі сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі ў аэрапорце Цяньцзіня.

**«Як і абяцаў, Аляксандр Лукашэнка прывёз для калег-лідараў па Шанхайскім аб'яднанні. «Першацвет» і «Брыз» — такімі сталі гатункі падарункавай бульбы. У прэзентах — і карысны рапсавы алей», — адзначылі ў тэлеэфіры.**

## «ПРАВІЛЬНА СКАЗАЛІ НАШЫ ЭКСПЕРТЫ»

Прэс-сакратара спыталі, як рэагаваць на заходнія ўкіды, якія характарызавалі сустрэчу ў Кітаі як «сход аўтакратаў» або «вось зла», у той час як айчынныя эксперты, наадварот, казалі, што гэта «вось дабра».




«Правільна сказалі нашы эксперты», — пагадзілася Наталля Эйсмант.

Яна расказала, што традыцыйна кожную раніцу, у тым ліку ў камандзіроўках, Прэзідэнту на стол кладзецца агляд усіх сусветных СМІ, дзе акцэнт робіцца на рэакцыю на праведзеныя мерапрыемствы і ўдзел у іх кіраўніка дзяржавы. Бачылі рэакцыю з боку Захаду і ў дадзеным выпадку.

«Рэакцыя цалкам і абсалютна чаканая. Напэўна, мы павінны былі б здзівіцца, калі б яе не было ці яна была б іншай, — сказала Наталля Эйсмант. — Яна ў першую чаргу падкрэслівае тое, наколькі на Захадзе заклапочаныя тым, што адбываецца ў нашай арганізацыі. Па-другое, яна выдатна дэманструе і пацвярджае нам раз за разам, што мы ідзём туды, куды трэба».

«Самы яркі, свежы прыклад: літаральна толькі што ў Генасамблеі ААН галасавалі па пытанні супрацоўніцтва з ШАС. Рэзалюцыю прынялі. 27 краін супраць, 28 — устрымаліся. Якія краіны супраць, якія ўстрымаліся — усе ўжо бачылі. І гэты факт таксама сам па сабе кажа шмат», — дадала прэс-сакратар.

## Меркаванні

### РАСІЙСКІ ПАЛІТОЛАГ РАСТЛУМАЧЫЎ, ЧАМУ БЕЛАРУСЬ ВАЖНАЯ ДЛЯ ШАС

**Беларусь важная для Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, адзначыў палітолаг, выкладчык эканамічнага факультэта Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў Фархад ІБРАГІМАЎ у эфіры тэлеканала «Беларусь 1».**

Па словах палітолага, Беларусь паслядоўна праводзіць суверэнную знешнюю палітыку. І членства ў ШАС прама ўказвае на тое, што краіна з'яўляецца суверэннай.

«У рамках ШАС збіраюцца тыя краіны, якія зацікаўлены ў правядзенні ўласнай, суверэннай знешняй палітыкі і развіцці эканамічных мадэляў, альтэрнатыўных Захаду», — сказаў Фархад Ібрагімаў.

Тлумачачы тэзіс аб тым, што ШАС важная для Беларусі і, адпаведна, Беларусь важная для ШАС, палітолаг звярнуў увагу на наступнае: Беларусь — адзіная класічная еўрапейская дзяржава з пункту гледжання сваёй геаграфіі і менталітэту, якая з'яўляецца членам ШАС. Іншыя дзяржавы знаходзяцца на стыку Еўропы і Азіі ці цалкам у Азіі.

Па словах Фархада Ібрагімава, знаходжанне Беларусі ў ШАС дадае гэтай арганізацыі дадатковага аўтарытэту.

Больш за тое, у Беларусі ёсць свае прапановы — Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка іх неаднаразова агучваў у рамках тых ці іншых мерапрыемстваў, звязаных з ШАС. Гэтыя прапановы могуць быць карысныя арганізацыі ў цэлым.

### «ЛІК 2:1»: ЭКСПЕРТ — АБ ФАРМІРАВАННІ ШМАТПАЛЯРНАГА СВЕТУ І РОЛІ «ШАНХАЙСКАЙ СЯМ'І»

**У свеце ўсяго тры краіны з ядзернай трыядай, і дзве з іх з'яўляюцца членамі ШАС, якая сёння становіцца адным з важных палюсоў шматпалярнага свету. Такі пункт гледжання ў праекце «У тэме» выказаў эксперт у галіне нацыянальнай бяспекі Аляксандр ЦІШЧАНКА.**

«Кітай — гэта яшчэ адна краіна, якая валодае ядзернай трыядай. Такіх усяго тры, і дзве з іх — у ШАС. Трамп зрабіў вялікую памылку, калі не прыехаў у Кітай і не пабываў на парадзе. Ён мог бы вельмі эфектыўна туды ўпісацца. Гэта была б вялікая тройка (краін, якія валодаюць ядзернай трыядай. — **Заўв. рэд.**). А цяпер лік 2:1 на карысць ШАС, на карысць Расіі і Кітая», — сказаў Аляксандр Цішчанка.

Эксперт звярнуў увагу, што Кітай — гэта ўжо далёка не тая краіна, якой яна была, напрыклад, два стагоддзі таму. Сучасны Кітай — гэта не толькі эканамічная, але і ваенная звышдзяржава. «Гэта краіна, з якой ваяваць не атрымаецца, таму што гэта будзе вельмі хутка і даволі трагічна для таго, хто гэта паспрабуе зрабіць», — падкрэсліў ён.

У тым ліку таму, мяркуе Аляксандр Цішчанка, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю Медыякарпарацыі Кітая заявіў, што ЗША не могуць абысціся без Кітая. «З Кітаем, як я кажу амерыканцам, трэба дамаўляцца. Кітай ператварыўся ў імперыю, без якой немагчыма вырашыць ніводнага глабальнага пытання ў сучасным свеце», — выказаў упэўненасць Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю Медыякарпарацыі Кітая.

**Па матэрыялах БелТА.**

НАДЗЁННАЕ

# РАЗМОВА НА РОЎНЫХ

## Падчас рэспубліканскай інфармацыйна-асветніцкай акцыі «Беларусь адзіная» ў Магілёве абмеркавалі тэму будучага

**Удзел у дыялогу прынялі вядомыя лідары грамадскага меркавання: палітолаг, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім ГІГІН, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Уладзімір ПАЎЛОЎСКІ, беларускі кінарэжысёр Кірыл ХАЛЕЦКІ. На сустрэчы ў МДУ імя А. Куляшова эксперты казалі пра тое, як важна маладым людзям быць актыўнымі, ініцыятыўнымі, мэтанакіраванымі і адзінымі. Знамянальна, што мерапрыемства адбылося напярэдадні Дня народнага адзінства.**

Тэма размовы, якая адбылася, — «Беларусь: стратэгія будучага». Тое, што моладзь з'яўляецца магутным драйверам, казала за сябе і выстаўка дасягненняў маладых вынаходнікаў ВНУ Магілёўшчыны. На ёй можна было ўбачыць інавацыйныя распрацоўкі маладых вучоных. Гэта і праграмнае забеспячэнне, і патрыятычныя праекты, і харчовыя распрацоўкі, і праекты пра захаванне народнай спадчыны, і нават універсітэцкае дакументальнае кіно. Большасць прысутных у зале складала таксама моладзь. Пытанні можна было задаць і праз чат-бот, перайсці ў які прапаноўвалася праз QR-код, размешчаны на экране. Спачатку меркаваннямі наконт будучага Беларусі падзяліліся спікеры.

Вадзім Гігін, напрыклад, закрануў актуальную сёння тэму палітыкі, расказаў пра дасягненні і выклікі, што існуюць. З дасягненняў ён адзначыў моцную прэзідэнцкую ўладу, мадэль народаўладдзя, якая набірае абароты, і тое, што народ адстаяў краіну ў самы небяспечны час. Праз пяць гадоў ён бачыць Беларусь прэзідэнцкай дзяржавай, мірнай і бяспечнай краінай, якая актыўна развівае Саюзную дзяржаву.

— Па ўсім свеценазіраецца крызіс нацыянальных ідэалогій, вялікі пераходны працэс, звязаны з фарміраваннем новага светаўладкавання, — падкрэсліў ён. — І вельмі важна знаць, якое месца зойме Беларусь у гэтым новым свеце, што фарміруецца. Наша грамадства павінна быць маналітным, размаўляць на адной мове і праз пакаленні трансліраваць тыя сэнсы, якія былі сфарміраваныя Прэзідэнтам.

Атрымалася пагутарыць і на тэму будучага беларускага кіно. Пры наведванні кінастудыі «Беларусьфільм» Прэзідэнт краіны звярнуў увагу на тое, што беларускі кінематограф павінен у найбліжэйшы час больш гучна заявіць пра сабе. І Кірыл Халецкі адзін з тых, хто працуе ў гэтым кірунку. Імя маладога беларускага кінарэжысёра ўжо вядома прыхільнікам кінамастацтва. Ён аўтар нашумелых у сацсетках фільмаў «Дарога», «Кіношнікі», «Культурны код», «Антракт», «Дзеда». Хутка ў відэапракат выйдзе яго новы фільм «Класная».

— Галоўнае — пачуць моладзь і падтрымаць, як гэта было са мной, — падзяліўся ён у размове з журналістамі. — У нашай краіне ўсё створана для таго, каб так і было. Трэба толькі не апускаць рукі, калі нешта адразу не атрымалася. Сёння на кінастудыі вялікі прыток маладых людзей. Іх падтрымліваюць, ім даюць зялёнае святло. Не сумняваюся, што хутка мы ўбачым шмат цікавых кінастужак.




Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Уладзімір Паўлоўскі акцэнтаваў увагу на тым, што для развіцця моладзі ў краіне створаны ўсе магчымасці.

> **— Нягледзячы на санкцыі, Беларусь працягвае развівацца, забяспечвае харчовую бяспеку, шукае новыя рынкі і нават пакарае космас, — адзначыў у сваёй прамове парламентарый. — Ва ўсіх гэтых кірунках дзяржава робіць стаўку на моладзь, таму што гэта інвестыцыі ў будучыню краіны.**

Пры гэтым вельмі важна, каб сувязь паміж пакаленнямі не перарывалася. У адзінстве наша сіла. Такі быў асноўны пасыл мерапрыемства.

— Гэты фармат размовы зразумелы і цікавы аўдыторыі, — выказаўся наконт інфармацыйна асветніцкай акцыі «Беларусь адзіная» Вадзім Гігін. — Галоўная ідэя, якая нас аб'ядноўвае, — гэта будучае Беларусі. І па тых акцыях, якія ўжо адбыліся ў іншых гарадах, можна сфарміраваць гэты вобраз. Мы кажам пра тыя тэмы, якія хвалююць грамадства, аналізуем пытанні, якія паступаюць у нашы чат-боты. Гэта форма сустрэч наватарская, запатрабаваная аўдыторыяй, дазваляе разняволіць людзей, выбудаваць больш адкрыты дыялог. У свой час цікавымі былі дыялогавыя пляцоўкі, якія паступова сышлі да лекцый. Калі мы бачым, што нейкія формы стасункаў страчваюць пазіцыі, прыдумваем новыя. Мы павінны гэта маштабіраваць, прасоўваць, абагачаць новымі фішкамі. Гэта выклікае водгук у людзей. Галоўнае — змест. Гэта і ёсць «Марафон адзінства», але ў іншых формах.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота БелТА.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# СУМЕСНЫМІ НАМАГАННЯМІ СУПРАЦЬ РЭАБІЛІТАЦЫІ НАЦЫЗМУ

## Акцэнты форуму Саюзнай дзяржавы «Роля моладзі ў захаванні і абароне гістарычнай памяці»



**Пленарнае пасяджэнне маладзёжнай канферэнцыі адбылося ў Музеі Славы Магілёўшчыны ў Буйнічах. Удзел у ім прынялі Старшыня Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, Старшыня Дзяржаўнай Думы Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Вячаслаў ВАЛОДЗІН і намеснік Старшыні Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар СЕРГЯЕНКА. Найперш удзельнікі форуму Саюзнай дзяржавы ўсклалі кветкі ў мемарыяльным комплексе «Буйніцкае поле».**



Выступаючы на пленарным пасяджэнні, Ігар Сергяенка падкрэсліў, што неабходна аб'ядноўваць намаганні для недапушчэння рэабілітацыі нацызму. «Фальсіфікацыя гісторыі як кампанент інфармацыйнай вайны — сур'ёзная пагроза нацыянальнай бяспецы, — канстатаваў ён. — Мы бачым, як, выкарыстоўваючы самыя сучасныя тэхналогіі, нам спрабуюць навязаць абыякавасць да подзвігаў нашых продкаў, пачуццё віны, непаўнацэннасці ў адносінах да Захаду, тым самым распальваючы нацыяналізм, нянавісць да іншых народаў і русафобію. Для гэтага на Захадзе Савецкі Саюз абвінавачваюць у развязванні Другой сусветнай вайны, а ўсім, хто мае традыцыйныя гістарычныя і сямейныя погляды на Перамогу ў Еўропе, забараняюць святое для іх свята».

Спікер звярнуў увагу на тое, што апаганьванне абеліскаў, знос помнікаў савецкім салдатам, героям-антыфашыстам у суседніх краінах накіравана на знішчэнне памяці, пераможнага духу, веры, унутранага стрыжня. У процівагу ўсяму гэтаму — каштоўнасці, на якіх грунтуецца Саюзная дзяржава.

> **«Братэрства, адзінства, згуртаванасць, імкненне самастойна вызначаць свой лёс, — канкрэтызаваў Ігар Сергяенка. — І ў гэтым сіла і праўда беларусаў і расіян, якіх немагчыма перамагчы зброяй, немагчыма перамагчы нічым. Таму вельмі важна з дапамогай такіх маштабных форумаў адстойваць агульную гістарычную праўду».**

Старшыня Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што святы абавязак пакаленняў, якія жывуць цяпер, — памятаць і ганарыцца подзвігамі дзядоў і прадзедаў, якія сталі на абарону Айчыны. «Іх подзвіг павінен быць часткай кожнай сямейнай гісторыі, што дапаможа ўмацаваць сувязь паміж пакаленнямі, асэнсаваць цану свабоды і забяспечыць мір», — адзначыў спікер.

Акрамя таго, гэтымі днямі ў Магілёве адбыўся XVIII фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву», які прадэманстраваў унёсак моладзі і ў развіццё культурнага патэнцыялу інтэграцыйнага аб'яднання.

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**
**Фота БелТА.**

ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

# НЕ МЕНШ ЗА ПАЛОВУ ПРАВІЛЬНЫХ АДКАЗАЎ

## Працоўныя мігранты будуць здаваць экзамен на веданне адной з дзяржаўных моў






**З 6 верасня скарэкціраваны падыходы да працаўладкавання замежных грамадзян. У прыватнасці, прынята пастанова Урада аб абавязковай праверцы ведання дзяржаўнай мовы для працоўных мігрантаў па асобных прафесіях (іх 11). Нюансы гэтага новаўвядзення растлумачыла першы намеснік міністра працы і сацабароны Таццяна АСТРЭЙКА.**

— Урад прыняў рашэнне, якое вызначае пералік прафесій рабочых і служачых, для заняцця якімі замежным грамадзянам давядзецца прайсці ацэнку ведання і валодання адной з дзяржаўных моў — беларускай ці рускай. Гэта вельмі важнае і адначасова простае рашэнне. У пералік уключаны такія рабочыя прафесіі, як вадзіцель аўтамабіля, прадавец, цырульнік, афіцыянт, адміністратар і шэраг прафесій медыцынскага профілю, сярод іх урач, памочнік урача, фельчар, акушэрка, медыцынская сястра, санітар. Усе яны прадугледжваюць непасрэдны кантакт з насельніцтвам. Гэта зроблена, каб павысіць якасць паслуг. Калі мы прыходзім у магазін, цырульню, садзімся ў таксі, мы выказваем свае пажаданні і павінны быць пачутымі. Патрабаванні да ацэнкі ведаў вызначаюцца з пункту гледжання аб'ёму, неабходнага для адносін, — не больш за тое, — падкрэсліла Таццяна Астрэйка, дадаўшы, што практыка моўнага экзамену для працоўных мігрантаў існуе ў шэрагу суседніх краін, у прыватнасці, у Расіі.

Трэба адзначыць, што названыя прафесіі з'яўляюцца запатрабаванымі як у наймальнікаў (па іх маецца 24 тысячы вакансій), так і ў замежных мігрантаў (па іх працуе каля 4 тысяч замежных работнікаў). Пры гэтым наша краіна зацікаўлена ў абароне нацыянальнага рынку працы, таму для замежнікаў адкрываюцца толькі тыя прафесіі, якія не запатрабаваны ў беларусаў.

Адметна, што апошнім часам Беларусь стала больш цікавай для працаўладкавання замежных работнікаў.

— Адным з важных фактараў з'яўляюцца рост узроўню аплаты працы, умовы працы, а таксама незадаволеная патрэба наймальнікаў з пункту гледжання працоўных рэсурсаў. За паўгоддзе колькасць замежных мігрантаў, якія прыехалі да нас у краіну, павялічылася ў 1,8 раза ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Як краіна — пастаўшчык замежнай працоўнай сілы лідзіруе Туркменістан. Напрыклад, у нас занята шмат вадзіцеляў з гэтай краіны, — расказала першы намеснік міністра.

Міністэрства адукацыі вызначыла пералік пунктаў ацэнкі ведаў, яны будуць у кожным абласным цэнтры і Мінску. Ацэнка ведаў будзе праводзіцца да заключэння працоўнага дагавора, і ён можа быць заключаны толькі ў тым выпадку, калі замежны мігрант станоўча прайшоў тэст на веданне мовы. Апошні праходзіць у пісьмовай форме, на яго здачу даецца 30 хвілін. Вынік будзе лічыцца станоўчым пры 50 % і больш правільных адказаў. Пры гэтым колькасць спроб можа быць неабмежаваная. Праводзіцца тэсты будуць двойчы на месяц: 15-га чысла і ў апошні дзень месяца.

Неабходная для наймальнікаў і замежных мігрантаў інфармацыя размешчана на партале службы занятасці. Там жа спецыялісты будуць тлумачыць усе пастаючыя пытанні.

Варта памятаць, што патрабаванні да ацэнкі ведання адной з дзяржаўных моў не распаўсюджваюцца на грамадзян ЕАЭС, гэта значыць Расіі, Арменіі, Кыргызстана і Казахстана.

**Алена КРАВЕЦ.**

УБОРАЧНАЯ-2025

# БУДЗЕМ З ЦУКРАМ, БУЛЬБАЙ І АГАРОДНІНАЙ

## Сельскагаспадарчыя работы ідуць па ўсіх франтах



**Паралельна з зернебабовымі на палях краіны працягваецца збор агароднінных культур — цяпер час цукровых буракоў і бульбы, крыху пазней надыдзе чарга морквы і іншай агародніны.**

Цукровыя буракі ўбраныя з 13 % плошчаў, што складае 12 тысяч гектараў. Накапана 608 тыс. тон караняплода сярэдняй ураджайнасцю 474 ц/га, што вышэй за леташнюю на 40,2 ц/га. У Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання чакаюць, што цяперашні ўраджай салодкага караняплода можа перавысіць 5 млн тон. Летась валавы збор склаў 4,951 млн тон. З гэтага ураджаю было выраблена 663 тыс. тон цукру, каля 300 тыс. тон з іх накіравана на экспарт. Мэта новага сезона, па словах спецыялістаў ведамства, — 5,1 млн тон, плюс 149 тыс. тон да мінулага года.

Уборка цукровых буракоў сёлета пачалася 20—21 жніўня, і гэта раней практычна на тыдзень, чым летась. Першымі копку пачалі аграрыі Гродзенскай вобласці. Сёння да гэтай работы падключыліся астатнія рэгіёны. Да канца жніўня, на думку спецыялістаў, якасны ўраджай салодкага караняплода ўжо сфарміраваўся: нягледзячы на халодную вясну і замаразкі, летам скláліся досыць спрыяльныя ўмовы — цёплае з багатымі ападкамі. І буракі паспелі набраць масу, таму і было прынята рашэнне пачаць іх уборку раней.

Добрыя развіткі, па словах спецыялістаў сельскагаспадарчага ведамства, і на ўраджай бульбы — больш за леташні ўзровень. На ўчора ў краіне накапана 101 тысяча тон клубняў пры ураджайнасці 342 ц/га, што вышэй за леташнюю на 33,1 ц/га. Спрыяльныя ўмовы сёння і для росту такіх культур, як морква, буракі і цыбуля. Адначасова вядуцца работы па падрыхтоўцы сховішчаў да закладкі агародніны на міжсезонны перыяд.

Па-ранейшаму пільная ўвага нарыхтоўцы кармоў: кукурузы на сілас і зялёны корм убрана з 8 % плошчаў, што складае 78 тыс. га. Сена нарыхтавана 461 тыс. тон, сенажу — 13,150 млн тон. Травяных кармоў нарыхтавана 4,481 млн тон. Працягваецца сяўба азімых культур.

**Паводле БелТА і прэс-службы Мінсельгасхарча.**
**Фота БелТА.**



# ТЭРЫТОРЫЯ МАГЧЫМАСЦЯЎ

## Юрый Чабатар: «Ключавы рэзерв для развіцця Пінска — новыя вытворчыя інвестпраекты»

Пра гэта заявіў міністр эканомікі Юрый Чабатар падчас рабочай паездкі ў Пінскі раён.

Як расказалі ў прэс-службе Мінэканомікі, кіраўнік ведамства наведаў тэрыторыю прамысловага парка, дзе азнаёміўся з ходам будаўніцтва інжынернай інфраструктуры. На думку міністра эканомікі, сёння інвестары арыентуюцца не толькі на прэферэнцыі, але і на аператыўнасць вырашэння працэдурных пытанняў і даступнасць пляцовак, якія дазваляюць хутка запусціць вытворчасць.

— Магчымасць пачаць працу літаральна дзень у дзень — падключыць абсталяванне і пачаць выпускаць прадукцыю — гэта сур'ёзная канкурэнтная перавага. Такі пілотны праект рэалізуецца сёння ў Пінску, — адзначыў Юрый Чабатар.

Міністр выказаў упэўненасць, што ў новай пяцігодцы прамысловы парк стане драйверам развіцця і ўмацуе статус Пінска як вядучага індустрыяльнага цэнтра беларускага Палесся.

Кіраўнік эканамічнага ведамства таксама наведаў шэраг арганізацый Пінска, якія рэалізуюць інвестыцыйныя праекты.

Так, у рамках ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект» завяршаецца мадэрнізацыя вытворчасці ТАА «Зубр Энерджы». Прадпрыемства «Стэнлес» паспяхова пашырыла свае магутнасці па вытворчасці мэблі. У перспектыўных планах групы кампаній 1AK-GROUP — будаўніцтва завода па выпуску пластыкавых камплектуючых для акумулятарных батарэй. А ў Пінскай цэнтральнай раённай бальніцы хутка з'явіцца новы інфекцыйны корпус.

— Кожная такая гісторыя поспеху — не толькі ўнёсак у эканоміку рэгіёна, але і фарміраванне пазітыўнага інвестыцыйнага іміджу. Гэта дапамагае прыцягваць новыя праекты, — пераканаы міністр.

На яго думку, не менш важна, каб жыхары адчувалі рэальныя змены: горад павінен станавіцца зручнейшы, быць больш сучасным і камфортным.

— У найбліжэйшыя гады трэба будзе многае зрабіць у частцы ўдасканалення сацыяльнай і транспартнай інфраструктуры, будаўніцтва жылля і добраўпарадкавання, — звярнуў увагу Юрый Чабатар.



# УЗАЕМНАЯ ЦІКАВАСЦЬ

## Мінпрам Беларусі ўмацоўвае супрацоўніцтва з Угандай



Намеснік міністра прамысловасці Беларусі Дзяніс Бакей правёў рабочую сустрэчу з дзяржаўным міністрам сельскай гаспадаркі, жывёлагадоўлі і рыбалоўства Уганды Брайтам Рвамірамам, паведамілі ў профільным міністэрстве.

Тут патлумачылі, што сёлетні год стаў адпраўным пунктам у прамысловым супрацоўніцтве Беларусі і Уганды. Адбылася серыя сустрэч і перагавораў на ўзроўні кіраўніцтва Мінпрама па пытаннях арганізацыі супрацоўніцтва ў сферы паставак сельскагаспадарчай тэхнікі і прамысловай кааперацыі.

Дзяніс Бакей выказаў гатоўнасць Міністэрства прамысловасці да рэалізацыі раней дасягнутых дамоўленасцяў на доўгатэрміновую перспектыву.

Бакі абмеркавалі праект мемарандума аб узаемаразуменні паміж міністэрствамі, дзе адлюстраваны ўсе пытанні патэнцыяльнага супрацоўніцтва: ад продажаў сельскагаспадарчай тэхнікі да арганізацыі яе зборкі, сэрвіснага абслугоўвання, навучання спажыўцоў.

Угандыйскім бокам таксама выказана зацікаўленасць у прапанове для Беларусі вырабленай у краіне прадукцыі: кавы, гарбаты і садавіны.

# САЮЗ «ПЯЦІ»

## Андрэй Сляпнёў: «Еўразійскі эканамічны саюз – важнае звяно Вялікага Еўразійскага партнёрства»

ЕАЭС

Пра гэта міністр па гандлі Еўразійскай эканамічнай камісіі Андрэй Сляпнёў заявіў, выступаючы на сесіі «Вялікае Еўразійскае партнёрства: новыя парадыгмы развіцця кантынента» ў рамках Усходняга эканамічнага форуму — 2025, паведамілі ў прэс-службе Еўразійскай эканамічнай камісіі.

Міністр па гандлі ЕЭК адзначыў, што пад уплывам COVID-19 рэзка выраслі кантакты па лініі лагістыкі, калі ўсе зразумелі, што неабходны дыверсіфікацыя маршрутаў і ўмацненне звязанасці. Паводле слоў Андрэя Сляпнёва, пад уздзеяннем розных выклікаў усё большае разуменне знаходзіць ідэя ўмацавання бяспекі фінансавых разлікаў і знаходжання фарматаў для ўстойлівага развіцця міжнароднага гандлю.

— Што датычыцца Еўразійскага эканамічнага саюза, які аб'ядноўвае пяць краін Еўразіі, то гэта адно з найважнейшых звёнаў партнёрства. У гэтым плане мы знаходзімся цалкам у ідэалогіі і ў духу Вялікага Еўразійскага партнёрства. Мы актыўна развіваем практычныя інструменты, на якіх хацелася б спыніцца падрабязней, — падкрэсліў Андрэй Сляпнёў.

Развіваючы гэту тэму, міністр ЕЭК расказаў аб дзейнасці камісіі па пагадненнях аб свабодным гандлі. Такія пагадненні дазваляюць адысці ад тарыфаў і ў пэўным сэнсе даць адказ на супрацьлеглыя падыходы, якія адстойваюць сёння некаторыя краіны.

Тут, на думку Андрэя Сляпнёва, важна не толькі «падняць шлагбаум» у выглядзе зніжэння тарыфных бар'ераў, але і стварыць добрую дарожную карту, пабудаваць дарогу для бізнесу, якая дапамагла б выбудоўваць кааперацыю.

— Гаворка ідзе ў тым ліку аб сухапутнай звязанасці кантынента, дзе важны прафесійны шматбаковы дыялог, каб міністры транспарту збіраліся за адным сталом і дамаўляліся аб «расшыўцы» вузкіх месцаў і лічбавізацыі транспартных калідораў. Не менш важныя фінансавыя інструменты, а таксама пытанні, звязаныя са стандартамі, якія з'яўляюцца магутным бар'ерам у гандлі, што шкодзіць не менш, чым залішне высокія тарыфы, — адзначыў міністр ЕЭК.

Асобна закрануты пытанні лічбавізацыі і кліматычнага парадку дня, якія патрабуюць абмеркавання і практычных рашэнняў, у тым ліку ў рамках ШАС і БРІКС.

— Партнёрства — гэта адсутнасць падзелу. Нашы лідары ўзаемадзейнічаюць у партнёрскім духу, але нам яшчэ трэба папрацаваць разам, каб ліквідаваць усе перашкоды на прафесійным узроўні, — рэзюмаваў Андрэй Сляпнёў.


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. УНП 500022448. Тел. (0154) 65 25 01 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 – **www.ipmtorgi.by** |

| № п/п | Инв. № | Наименование предмета электронных торгов | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 6076/1 | **Разбрасыватель минеральных удобрений РМУ-8000**, 2012 г. в., расположенный по адресу: Гродненская область, Лидский р-н, д. Далекие | **8 640,00** (снижена на 50 %) |
| 2 | 5183 | **Сеялка AMAZONE AVANT,** 2002 г. в., расположенная по адресу: Гродненская область, Лидский р-н, а/г Крупово | **36 144,00** (снижена на 40 %) |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после электронных торгов

**Срок оплаты предмета аукциона: 10 (десять) рабочих** дней с момента заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 8 % от цены продажи лота № 1 и 6 % от цены продажи лота № 2 в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

*Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.08.2025*

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 30.09.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 29.09.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37, +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор аукциона)*
по поручению **ОАО «Белслучь»** *(Продавец)*
проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот 1: коровник (инв. № 78)**
**с инв. № 644/С-63620 общ. пл. 1500,1 кв. м**
**и коровник (инв. № 77)**
**с инв. № 644/С-63615 общ. пл. 1518,0 кв. м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 625081300001000041 (право аренды по 10.07.2073) площадью 1,1512 га по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Домановичский с/с, 23, вблизи д. Домановичи.**

Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: охранная зона электрических сетей (0,1151 га).

Начальная цена с НДС (20 %) – **65 040,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **6 504,00** бел. руб.

**Лот 2: склад запасных частей**
**с инв. № 644/С-63609 общ. пл. 240,5 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625080800001000018 (право аренды по 25.04.2073) площадью 0,1901 га по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Долговский с/с, 2А, р-н д. Желтый Брод.**

Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильных дорог (0,1901 га).

Начальная цена с НДС (20 %) – **44 880,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **4 488,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **13.10.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.10.2025** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-64, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра (8029) 102-93-24.**

УНП 600071222

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА НА ПОВЫШЕНИЕ ЦЕНЫ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ЗАО «Цептер Банк», г. Минск, ул. Платонова, 1Б. УНП 807000214 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронного аукциона**

**Здание швейного раскройного цеха**

(**785,20 кв. м,** инв. № 611/С-190).

**Адрес: Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Мультана, 62В.**

***Сведения о земельном участке*:** пл. 0,2927 га предоставлен на праве аренды (срок действия по 02.08.2062) для размещения объектов неустановленного назначения (обслуживания здания швейного и закройного цеха). Ограничения (обременения): охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт (пл. 0,0374 га)

**Начальная цена лота (без НДС) – 109 954,31 бел. руб.**

**Примечание. Цена продажи лота указывается в договоре купли-продажи с учетом НДС*

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by.
Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение организатору торгов по лотам 3 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

*Предыдущая публикация извещения в газете «Звязда» от 22.11.2024*

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 23.09.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 22.09.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны:** +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
**E-mail:** auction@cpo.by



**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Лот № 1**
**Агрегат электронасосный АДН 900-60**
с эл. дв. 200 кВТ, складской номер 14516

| **Начальная цена, руб. (с учетом НДС)** | **13 560,00** | **Размер задатка, руб.** | **1 356,00** |
|---|---|---|---|

**Местонахождение:** Брестская обл., Брестский р-н, Знаменский с/с, северо-восточнее н. п. Прилуки.
**Продавец:** РУП «Белоруснефть-Брестоблнефтепродукт», 224018, г. Брест, ул. ГОБК, 13, тел./факс 80162270713.
**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления.
**Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901

**Аукцион состоится 24 сентября 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **(https://au.nca.by/auction/32996),** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 23 сентября 2025 г. до 17.00**






# XXXII ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА ПРЫМАЛА СТАРАЖЫТНАЯ ЛІДА






## «ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА БУДЗЕ САДЗЕЙНІЧАЦЬ РАЗВІЦЦЮ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ»

Урачыстае адкрыццё XXXII Дня беларускага пісьменства адбылося ў фармаце тэатралізаванага прадстаўлення — гістарычнага падарожжа праз прызму гісторыі і сучаснасці Лідчыны. **Намеснік Прэм'ер-міністра Наталля ПЯТКЕВІЧ** перадала прывітальны адрас удзельнікам і гасцям фестывалю ад кіраўніка дзяржавы. «Дзень беларускага пісьменства будзе садзейнічаць развіццю культурнай спадчыны Беларусі. Найлепшыя прыклады беларускай літаратуры належаць не толькі нашаму народу, але і ўсяму свету. Таму наша дзяржава ўсяляк падтрымлівае беларускіх літаратараў і нашы выдавецтвы. Мы заўсёды памятаем пра важнасць гэтага духоўнага скарбу — айчыннай літаратуры — і пра нашу адказнасць за яго захаванне. Сувязь пакаленняў з'яўляецца надзейным падмуркам беларускай дзяржаўнасці. Упэўнена, што Дзень беларускага пісьменства будзе і ў далейшым садзейнічаць развіццю культурнай спадчыны».

**Міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ** падзяліўся сваім бачаннем знакавай падзеі: «Гэта сапраўды народнае свята, свята беларускай мовы ў першую чаргу, якое павінна прыходзіць да кожнага чалавека, незалежна ад таго, у якім населеным пункце ён жыве. На мой погляд, чым больш увагі мы будзем удзяляць малой радзіме, малым населеным пунктам, тым больш будзем спрыяць іх развіццю і тым лепш будзе для ўсёй Беларусі». Ён адзначыў, што людзі жадаюць свята і актыўнага ўдзелу ў ім, і падкрэсліў, што геаграфічнае месца правядзення свята не з'яўляецца першарадным: «Галоўнае — свята прыйдзе да людзей», — падагульніў міністр.

**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНІЯМІН, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі**, падчас урачыстай цырыманіі заявіў, што Дзень беларускага пісьменства мае глыбокія карані ў гісторыі. Ён адзначыў духоўныя подзвігі роўнаапостальных Кірыла і Мяфодзія, святой Ефрасінні Полацкай: «Праз стагоддзі гэтыя святыя неслі і нясуць нам сёння святло слова і ведаў. Нядаўна мы адзначалі 900-годдзе Полацкага Свята-Ефрасіннеўскага манастыра. Ён і сёння застаецца месцам вялікага паломніцтва для беларусаў і гасцей краіны. Сімвалічна, што падчас Дня беларускага пісьменства заўсёды праходзіць навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў», дэвізам якой сталі знакамітыя словы Сергія Раданежскага: «Адзінства і любоў выратуюць нас».

## СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ — У ПРАЕКЦЕ «ЧАС ВЫБРАЎ»

Да Дня беларускага пісьменства арганізатарамі была падрыхтавана насычаная праграма. У прыватнасці, адбыўся гала-канцэрт удзельнікаў рэспубліканскага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка», перад пачаткам якога ўзнагародзілі яго пераможцаў і прызёраў у чатырох узроставых групах. Дарэчы, сёлета ў конкурсе паўдзельнічалі звыш 20 тысяч школьнікаў, а ў фінал трапілі ўсяго 18 чалавек.

Наведалі госці і знакавую прэзентацыю ўнікальнага кніжнага выдання «ЧАС ВЫБРАЎ», у якой узялі ўдзел дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Вольга Ануфрыева, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» Дзмітрый Жук, аглядальнік рэдакцыі Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» Максім Осіпаў.

Падрыхтавана і выпушчана ў свет выданне было Выдавецкім домам «Звязда». У яго аснову пакладзены праект Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» «ЧАС ВЫБРАЎ». Падняўшы з архіваў усю цэнтральную перыёдыку краіны за 1994—2025 гады (больш чым 20 тысяч выпускаў пяці газет), журналісты выявілі рэтраспектыву станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці ў перыяд суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны.










(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Вольга АНУФРЫЕВА** адзначыла, што ўнікальнасць гэтага праекта заключаецца ў адсутнасці суб'ектыўных меркаванняў і ацэнак: «Гэта жывая рэтраспектыва таго, што адбывалася. Вось рэальныя загалоўкі: «Не магу купіць хлеба чатыры дні», «Міна пад калгас», «Сасіскі — у масы, масы — на плошчу», «Рынак з вялікай дарогі, або Рэкет па-гомельску»... Некалі ўсё гэта было рэальнасцю. Але ў нас ужо сціраюцца гэтыя ўспаміны, бо тыя 30 гадоў, якія мы прайшлі пад кіраўніцтвам Аляксандра Рыгоравіча, сведчаць: сёння мы можам нарэшце жыць вельмі добра».

## ЧЫМ ЯШЧЭ ЗДЗІЎЛЯЛІ ГАСЦЕЙ СВЯТА?

У рамках святкавання Дня беларускага пісьменства працаваў Фестываль кнігі і прэсы, у якім узялі ўдзел больш за 100 літаратараў з усёй Беларусі. Кожная вобласць прапанавала сваю літаратурную экспазіцыю, дзе можна было пазнаёміцца з навінкамі выданняў і ў цэлым літаратурным патэнцыялам рэгіёна. Праводзіліся прэзентацыі новых кніг, сустрэчы з пісьменнікамі і аўтограф-сесіі. Людзі актыўна знаёміліся з выданнямі, набывалі кнігі.

Дарэчы, Выдавецкі дом «Звязда» прывёз на выставу цікавыя кніжныя экзэмпляры. **Вядучы спецыяліст аддзела рэалізацыі Наталля МАРУК** паведаміла, што найбольшым попытам карысталася падлеткавая літаратура, якая закранае сур'ёзныя тэмы: узаемаадносіны розных пакаленняў, цяжкасці сталення: «Таксама нямала выданняў, якія прысвечаны геаграфіі Беларусі, шырока прадстаўлена дзіцячая літаратура. Можна пазнаёміцца са школьнымі выданнямі, рэкамендаванымі Мінадукацыі, з работамі маладых аўтараў. Ёсць кнігі аб развіцці Беларусі пасля распаду СССР і серыя выданняў, прысвечаных славутасцям, гісторыі гарадоў і ваеннай тэматыцы».

Яшчэ адной яркай падзеяй стала адкрыццё тэматычнага мурала на будынку раённай бібліятэкі, на фасадзе якой размясціўся партрэт славутага паэта Янкі Купалы. Адбылося ўрачыстае гашэнне памятнага канверта. Міністэрства сувязі і інфарматызацыі выпусціла ў абарачэнне канверт з арыгінальнай маркай «Дзень беларускага пісьменства». Ілюстрацыя «Ліда. Дзень беларускага пісьменства» ўключае выяву помніка Францыску Скарыну, Лідскага замка, а таксама эмблему Дня беларускага пісьменства і герб горада.

Урачыста адкрылі ў Лідзе новы арт-аб'ект пад назвай «Верабейкі». Мясцовы скульптар увасобіў ідэю, натхнёную аднайменным вершам паэта і ўдзельніка нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі. Арт-аб'ект стаў падарункам гораду да свята друкаванага слова. Ініцыятыва яго стварэння належала калектыву Лідскага гісторыка-мастацкага музея, які знаходзіцца ў Доме Валянціна Таўлая. Менавіта тут ва ўзросце сямі гадоў паэт напісаў свой першы верш «Верабейкі», які стаў асновай для арт-аб'екта. Кампазіцыя ўключае вялікую кнігу, у якой радкі верша надрукаваны звычайным шрыфтам на адной старонцы і шрыфтам Брайля — на іншай. Гэта дазваляе людзям з парушэннем зроку таксама азнаёміцца з творам лідскага аўтара. Задуму музейшчыкаў увасобіў мясцовы скульптар Рычард Груша.

Як ужо было адзначана, Дзень беларускага пісьменства сёлета быў прысвечаны ў тым ліку 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, таму асобную ўвагу ўдзялілі ўскладанню кветак да Кургана Неўміручасці. Гэтая падзея яшчэ раз падкрэслівае, што нацыянальная культура і гісторыя цесна пераплецены. І памяць пра страшныя падзеі мінулага заўсёды будзе жыць у сэрцах беларусаў. Не пакінула абыякавымі гасцей і ваенна-гістарычная рэканструкцыя, якая прайшла на пляцоўцы каля Кургана Неўміручасці. Яе сюжэт быў прысвечаны знакавай даце — падзеям 17 верасня 1939 года.

У нядзелю ў Лідскім гісторыка-мастацкім музеі прайшла прэзентацыя трох кніг: «Лідскі край: з любоўю і назаўжды», «Край наш вольны, край любімы», «З Міхасём і Міхалінкай крочым роднымі сцяжынкамі», якія выпусцілі ў свет Выдавецкі дом «Звязда», а таксама выдавецтвы «Беларусь» і «Мастацкая літаратура». Яны расказваюць пра гісторыю і сучаснасць Лідчыны, яе славутасці, пра пісьменнікаў, якія звязаны лёсам з лідскім краем.

Сапраўдным падарункам ад Саюза пісьменнікаў Беларусі стала літаратурна-музычная імпрэза «Узнагародай памяць і жыццё» на галоўнай сцэне фестывалю. Таксама адбылося ўручэнне ўзнагарод рэспубліканскага конкурсу сярод СМІ «Хвала рукам, што пахнуць хлебам» на найлепшае асвятленне ў СМІ і інтэрнэце ўборачнай кампаніі 2025 года. Для ўдзелу ў гэтым конкурсе сёлета была даслана самая вялікая колькасць заявак — 135.

Гала-канцэрт пры ўдзеле Нацыянальнага Прэзідэнцкага аркестра стаў фінальным акордам двухдзённага свята. На галоўнай сцэне ў Лідзе ўрачыста перадалі эстафету Дня беларускага пісьменства гораду Касцюковічы — менавіта тут пройдзе фестываль у наступным годзе.


**Яна ВАЛАСАЧ,**
**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД,**
**Веранікі КАЗЛОЎСКАЙ.**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор аукциона)* по поручению
**открытого акционерного общества «Селевцы»**
*(Продавец)*
проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1: здание «Молочная»**
**с инв. № 630/С-84634 общей площадью 80,9 кв. м, расположенное на земельном участке площадью 0,0937 га с кадастровым номером 623881303601000342 по адресу: Минская область, Молодечненский район, Городокский с/с, аг. Городок, ул. Молодечненская, 58.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона, пл. 0,0937 га; охранная зона электрических сетей, пл. 0,0093 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **5 460,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **546,00** бел. руб.
Стоимость снижена на 50 %.

**Лот № 2: здание котельной**
**с инв. № 630/С-42625 общей площадью 989,3 кв. м**
*(составные части и принадлежности: мазутонасосная, металлическая трансформаторная подстанция, 2 резервуара смешанной конструкции, металлический мазутослив, дымовая труба с дымоходом смешанной конструкции, асфальтобетонное покрытие, 4 металлические емкости, кирпичный бункер мокрого хранения соли, водопроводная сеть протяженностью 270,6 кв. м, канализационная сеть протяженностью 176,8 кв. м, ливневая канализация протяженностью 320,9 кв. м, тепловая сеть протяженностью 26,0 кв. м, газопровод протяженностью 190,5 кв. м, линия освещения протяженностью 248,9 кв. м)***,**

**расположенное на земельном участке площадью 1,6196 га с кадастровым номером 623850100003002673 по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 31К.**

*На территории земельного участка расположены подземные кабельные ЛЭП напряжением до 10 кВт (пл. 0,1091 га), подземные кабельные ЛЭП напряжением свыше 10 кВт (пл. 0,0157 га), ливневая канализация (пл. 0,3578 га), а также охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,2504 га), канализации (пл. 0,2393 га), теплоснабжения (пл. 0,0966 га) и газоснабжения (пл. 0,1753 га).*

Начальная цена с НДС (20 %) – **84 720,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **8 472,00** бел. руб.
Стоимость снижена на 80 %.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в следующем размере: 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона в отношении лота № 1, 5 (пяти) процентов в отношении лота № 2.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения по лоту № 1 опубликованы в газете «Звязда» от 12.04.2025, 30.07.2025, по лоту № 2 – от 08.02.2024, 02.04.2024, 08.05.2024, 11.06.2024, 09.07.2024, 30.07.2025.

Аукцион состоится **23.09.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.09.2025** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (80176) 58-92-40, 8 (029) 660-07-55.**

УНН 690019777



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор аукциона)* по поручению
**УП «Борисовский комбинат хлебопродуктов» ОАО «Минскоблхлебопродукт»** *(Продавец)*
проводит открытый аукцион по продаже

**АДМИНИСТРАТИВНОГО ЗДАНИЯ**
**с инв. № 610/С-66259 общ. пл. 224,8 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620886403101000390 (право аренды по 01.09.2112) пл. 0,0938 га по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, Лошницкий с/с, аг. Новоселки, ул. Ленинская, 40.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 45 600,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 4 560,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата объекта производится в течение 5 (пяти) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **13.10.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.10.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра (8025) 910-41-29.**

УНП 600033917

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Малоберестовицкий элитхоз». 231780, Гродненская обл., Берестовицкий р-н, аг. Малая Берестовица, ул. Юбилейная, 1. УНН 500020907 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Здание кирпичного завода**
(Здание специализированное для производства строительных материалов), инв. № 411/С-16990, общ. пл. 3838,8 кв. м, сост. части и прин-ти: подъездная дорога).
Адрес: **Гродненская обл., Берестовицкий р-н, Малоберестовицкий с/с, 24, вблизи д. Мурована**
***Сведения о земельном участке 420482500001000169*:**
пл. **1,2013 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 19.05.2123)
для строительства и обслуживания здания кирпичного завода

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 241 794,38 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере **4 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 10.10.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 09.10.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37, +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЯВЛЕННЫХ ТОРГАХ И ПРЕДМЕТЕ ТОРГОВ

**Организатор электронных торгов:** комитет «Минскоблимущество», тел.: (8017) 5004711, 5004710, 5168055.

**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by.

**Дата проведения электронных торгов: 2 октября 2025 г.**

**Лот № 7.**
**Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 601/С-23208) – одноэтажное **здание клуба,** общ. пл. 180,0 кв. м, 1989 г. п., расположенное по адресу: Минская обл., Логойский район, Октябрьский с/с, д. Сукневичи, ул. Полевая, 2А.

**Начальная цена предмета электронных торгов: 29 700,00 руб.**
*(Начальная цена понижена на 50 %).*

**Продавец:** Октябрьский сельский исполнительный комитет.

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на официальных сайтах Минского областного исполнительного комитета **www.minsk-region.gov.by,** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by.**

УНП 600181656

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»** (Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **РУП «БЕЛПОЧТА»** (Продавец) на праве хозяйственного ведения.

**Электронные торги состоятся 10.10.2025.**

**Лот № 1:** SKODA SUPERB,
кузов (рама) № TMBAB43T3D9024452.

Начальная цена с НДС 20 % – 16 200,00 руб.

Местонахождение: г. Минск, ул. Лукьяновича, 6.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by** и на электронной торговой площадке «**GOSTORG» (gostorg.by).**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**

УНП 190055182

КРАНАЛЬНАЕ

# АД ЛІСТА ПРЭЗІДЭНТУ — ДА ПЕРШАГА ЎРАДЖАЮ

## Як кіраўнік дзяржавы здзейсніў мару дзяўчынкі з Гомельскага раёна

Напярэдадні Дня народнага адзінства ў Гомельскім раёне гатовы радаваць невялікі, але вельмі кранальны сімвал адзінства і добрых спраў — кавуны, вырашчаныя з насення, якое перадаў Прэзідэнт. Аб тым, як клопат і вера ў тое, што нават простая мара здольная прынесці радасць многім, цяпер дакладна ведае школьніца з Гомельскага раёна Карына МУРАШКА — яе мара ажыццявілася на самым высокім узроўні.

Карына з Гомельскага раёна — школьніца, у якой за плячыма пакуль што толькі першы вопыт сур'ёзнай працы на зямлі, але ў душы — вялікае жаданне рабіць дабро. Дзяўчына вучыцца ў Гомельскай сярэдняй школе № 31, добра спраўляецца з урокамі, актыўна ўдзельнічае ў жыцці класа, дзейнасці атрада юных міратворцаў і БРСМ. Гэтай вясной пра Карыну даведаліся далёка за межамі яе роднага раёна.

Усё пачалося з ліста. У студзені, назіраючы за падзеямі ў краіне і ўразіўшыся перамогай Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі на выбарах, Карына вырашыла павіншаваць Прэзідэнта і падзяліцца сваёй дзіцячай, але вельмі сур'ёзнай марай. Яна напісала ад рукі ліст, поўны шчырасці і павагі, і папрасіла насення кавуноў, якія вырошчваюць на падворку кіраўніка дзяржавы.

— Я ўбачыла калісьці, як Прэзідэнт нашай краіны разам з сынам Мікалаем перадавалі кавуны дзецям у інтэрнат, — успамінае Карына. — Захацела таксама паспрабаваць такія вырасціць і падзяліцца ўраджаем з тымі, каму патрэбна падтрымка.

Бацькі школьніцы Дзмітрый і Юлія Мурашкі добра памятаюць той вечар: «Дачка папрасіла дапамагчы знайсці адрас Адміністрацыі Прэзідэнта. Мы прачыталі ліст — ён быў просты і кранальны. Падтрымалі яе».

Просьба Карыны дайшла да адрасата. Прэс-сакратар кіраўніка дзяржавы Наталля Эйсмант перадала насенне кавуноў старшыні Гомельскага аблвыканкама Івану Крупко. Але на гэтым усё не скончылася: па даручэнні

# СТУДЭНЦКАЯ СЯМ'Я

## Ва ўніверсітэтах Беларусі праходзіць

# ГУЧНЫ СТАРТ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

## Асаблівасці «Месяца першакурсніка» ў галоўнай ВНУ краіны

Як расказала прарэктар па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце БДУ Ганна БАКУН, ва ўніверсітэце «Месяц першакурсніка» пачаўся з урачыстай лінейкі ў гонар Дня ведаў. Ужо ў першыя дні для больш чым дзвюх тысяч студэнтаў першага курса куратары правялі інфармацыйныя гадзіны: разбіралі Статут універсітэта, яго Этычны кодэкс, тлумачылі правілы пражывання ў інтэрнатах. На асобных сустрэчах, прысвечаных размовам аб праве і парадку, нядаўнім школьнікам расказалі, што значыць быць паўналетнім і адказваць за свае ўчынкі. А паспрыяць згуртаванню маладых людзей, дапамагчы ім хутчэй адаптавацца ў новым калектыве заклікаліны спецыяльныя трэнінгі ад сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службаў ВНУ.



Дарэчы, сёлета першакурснікаў БДУ чакае яшчэ больш насычаны на падзеі верасень. Калі раней асноўная тэматыка мерапрыемстваў зводзілася да побыту і навучальнага працэсу, адаптацыі, то цяпер значна пашырылася. На лекцыях і дыскусіях спікеры гавораць аб грамадзянскай адказнасці, бяспецы і ўстойлівым развіцці. Першую лекцыю «Эстафета пакаленняў: захоўваючы мінулае, ствараем будучыню» правёў рэктар БДУ Андрэй Кароль. Слухачамі сталі тыя першакурснікі, якія набралі максімальную колькасць балаў па ЦЭ і ЦТ, а таксама пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд і конкурсаў.

Па словах прарэктара па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце, студэнты лепш за ўсё адгукаюцца на падзеі, дзе спалучаюцца нефармальная абстаноўка і магчымасць прамога дыялогу. «Маладыя людзі шануюць парады «з першых рук», а таму сустрэчы з кіраўніцтвам універсітэта нязменна збіраюць поўныя залы і спрыяюць больш хуткай адаптацыі да новых умоў», — адзначыла Ганна Бакун. Падобны цыкл адкрытых дыялогаў з адміністрацыяй універсітэта ўжо запушчаны. Гучаць ідэі Года добраўпарадкавання: наваспечаным студэнтам расказваюць, які ўнёсак яны могуць зрабіць у жыццё горада і ўніверсітэта, як стаць удзельнікамі валанцёрскіх праектаў па добраўпарадкаванні і экаакцый. Асаблівая ўвага — прафілактыцы кіберзлачынстваў, экстрэмізму і асацыяльных паводзін.

Сапраўднай прыгодай для першага курса становіцца і знаёмства з карпусамі навучальнай установы. Замест сумных экскурсій — інтэрактыўныя квэсты з загадкамі і маршрутамі па факультэце. У гульнявым фармаце хлопцы і дзяўчаты даведваюцца пра месцазнаходжанне неабходных кожнаму студэнту аўдыторый і арганізацый: бібліятэкі, лабараторыі, студэнцкага савета і не толькі. Не менш цікавасці выклікае «Кірмаш актыўнага студэнта»: прадстаўнікі маладзёжных грамадскіх арганізацый збіраюцца, каб прэзентаваць вынікі сваёй дзейнасці і дапамагчы навенькім ужо на першым тыдні стаць актыўнымі ўдзельнікамі студэнцкага жыцця.

Паводле звестак БДУ, у першыя дні «Месяца першакурсніка» ў яго мерапрыемствы былі ўцягнуты амаль 7 тысяч чалавек. Да канца месяца абяцаюць новыя круглыя сталы, прафілактычныя лекцыі, майстар-класы і сустрэчы ў фармаце адкрытага дыялогу — сумаваць першакурснікам не давядзецца.

**Аміна НАЗАРАВА.**
**Фота прэс-службы БДУ.**

старшыні аблвыканкама да справы падключыліся і спецыялісты. З сям'ёй Мурашкаў пазнаёмілася Тамара Сідарэнка, кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт, загадчыца аддзела бульбаводства і пладаводства абласной сельгасдаследчай станцыі НАН Беларусі. Менавіта пад яе кіраўніцтвам Карына і яе бацькі спасцігалі прамудрасці няпростай культуры — да гэтага кавуны яны не вырошчвалі.

— Нам расказалі, што вырошчваць кавуны — задача няпростая, важна вытрымліваць тэхналогію. Растлумачылі, як правільна рыхтаваць расаду, калі і як перасаджваць яе ў грунт, — расказвае Карына Мурашка.

Лета аказалася не самым спрыяльным: частыя дажджы, халодныя ночы, туманы. Каб захаваць кожную расліну, даводзілася то прыкрываць пасадкі, то раскрываць іх, сачыць за палівам. Усё рабілі разам.

— Я шчаслівая, што спраўдзілася мая мара, — прызнаецца Карына Мурашка. — Так, кавуны вырошчваць гэтым летам было цяжка: як нам сказалі спецыялісты, сезон выдаўся «не кавуновым». Але мы справіліся! Шчыра хачу падзякаваць нашаму Прэзідэнту Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку, старшыні аблвыканкама Івану Іванавічу Крупко, Тамары Мікалаеўне Сідарэнка, маім бацькам і маёй бабулі Святлане Іванаўне за дапамогу ў гэтай нялёгкай і адказнай справе.

Дарэчы, ураджай кавуноў сям'я Мурашкаў атрымала даволі грунтоўны: 25 ягад, якія заважылі ад чатырох да шасці з паловай кілаграмаў. Напярэдадні Дня народнага адзінства Карына і яе сям'я прывезлі свой ураджай ва Улукаўскую спецыяльную школу-інтэрнат. Ва ўстанове выхоўваецца 164 дзіцяці, з іх 60 — сіроты.



**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота ТК «Гомельшчына афіцыйна».**

# ВІТАЕ МАЛАДЫХ

**«Месяц першакурсніка»**

## VADEMECUM: ІДЗІ СА МНОЙ!

### Як адаптуюцца да студэнцкага жыцця першакурснікі Віцебскай ветакадэміі

Улічваючы дапытлівасць, таленавітасць і «прасунутасць» студэнцкай аўдыторыі, няправільна было б думаць, што на дапамогу адаптацыйнай акцыі не паспрабуюць прыцягнуць штучны інтэлект. У Віцебскай ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны паспрабавалі гэта зрабіць. І ў іх атрымалася. Падрабязней аб праекце расказала рэктар акадэміі Вольга ГОРЛАВА.

— Свой прадукт студэнты назвалі «Вадэмекум», — паведаміла кіраўнік ВНУ. — З лацінскай мовы назва перакладаецца як «ідзі са мной» або «даведнік» і азначае кішэнны даведнік ці дапаможнік. І для першакурсніка так яно і ёсць!

Рэктар таксама расказала, што стварэнню гэтага прадукту папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа выкладчыкаў і студэнтаў, было зроблена апытанне і на падставе сабраных матэрыялаў з дапамогай штучнага інтэлекту створана цэлая праграма ў дапамогу першакурсніку.

**— Студэнты туды заходзяць і знаходзяць адказы на ўсе пытанні, якія датычацца не толькі вучобы, але і побыту, — растлумачыла Вольга Горлава. — Там жа яны знаёмяцца з асноўнымі ветэрынарнымі дысцыплінамі і іх значэннем, атрымліваюць інфармацыю аб структуры навучальнага года, правілах наведвання заняткаў і здачы экзаменаў. У «Вадэмекуме» яны знойдуць інфармацыю пра размяшчэнне аўдыторый, прозвішчы, імя, імя па бацьку выкладчыкаў, дзе і якія дысцыпліны выкладаюцца і нават пункт грамадскага харчавання з меню і цэнамі. Усё вельмі зручна, зроблена на сучасным узроўні, адаптавана пад смартфоны і не патрабуе асаблівых дадаткаў.**

Як адзначае кіраўнік ВНУ, першакурснікі пачалі карыстацца сэрвісам ужо сёлета. Аднак наяўнасць такога памочніка не выключае і жывых зносін — куратары і студэнты старшых курсаў таксама дапамагаюць адаптавацца.



— Любая дапамога будзе дарэчы, — працягнула рэктар ветакадэміі. — У нас вялікая тэрыторыя — 15 гектараў, вельмі шмат навучальных карпусоў і студэнцкіх інтэрнатаў. Хоць гэта ўсё размешчана кампактна, у межах студэнцкага гарадка, тым не менш чалавек, які ўпершыню сюды трапіў, можа і не сарыентавацца.

Акрамя «Вадэмекума» для будучых ветэрынараў арганізавана акцыя «Маршрут пабудаваны», якая ўключае аглядныя і азнаямленчыя экскурсіі не толькі па студэнцкім гарадку, але і па Віцебску.

— Гэты прадукт таксама створаны нашымі студэнтамі, учарашнімі, дарэчы, першакурснікамі, — заўважыла Вольга Горлава. — Ён стане добрым памочнікам як для беларускіх студэнтаў, так і для замежных навучэнцаў акадэміі з Расіі, Украіны, Літвы, Казахстана, Азербайджана, Дэмакратычнай Рэспублікі Конга, Лівана і Сірыі.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Віцебскай ветэрынарнай акадэміі.**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайты в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ООО «БелВЭБ Капитал», УНП 193279646, 220036, г. Минск, ул. К. Либкнехта, д. 66, пом. 21А (комната 1) |

**Предмет электронного аукциона**

**Первые публичные торги в форме электронного аукциона**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|
| **1** | Комплекс, состоящий из трех капитальных строений (581,7 кв. м, 58,1 кв. м, 107,4 кв. м), расположенный по адресу: г. Молодечно, ул. Виленская, 10 и 10Б | 1 226 670,17 |
| **2** | Изолированное помещение, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Якубова, 10-3, общ. пл. 1 126,1 кв. м, назначение объекта – административное помещение | 2 490 437,88 |
| **3** | Комплекс, состоящий из пятнадцати изолированных помещений (628,9 кв. м, 78,0 кв. м, 20,1 кв. м, 96,8 кв. м, 6,3 кв. м, 5,2 кв. м, 134,2 кв. м, 14,3 кв. м, 568,9 кв. м, 567,6 кв. м, 568,5 кв. м, 331,0 кв. м, 406,5 кв. м, 570,3 кв. м, 453,6 кв. м), расположенный по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6 | 10 877 126, 88 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронного аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота

Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций –- Торги» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) рабочих дней** со дня проведения электронного аукциона

В лотах №№ 1, 2 и 3 имеется обременение – ипотека. Имеются арендаторы

**Условия оплаты предмета электронного аукциона: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества. с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним

Электронный аукцион проводится в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций - Торги», размещенном по адресу: https://iintorgi.by

Победитель электронного аукциона либо единственный участник, которому будет предложен для приобретения предмет электронного аукциона (претендент на покупку), обязан возместить организатору электронного аукциона затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере **0,5 % от цены продажи лота**

Организатор электронного аукциона имеет право снять предмет электронного аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения электронного аукциона

**Дата и время проведения электронного аукциона:** 09.10.2025,
начало электронного аукциона: 10.00,
окончание электронного аукциона: 16.00,
электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона.
Заявки на участие в электронном аукционе принимаются **с 09.09.2025 по 08.10.2025 г. до 17.00**

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: a.korotkaya@iin.by** |

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**Государственному предприятию
«Институт системных исследований
в АПК НАН Беларуси»**
на праве хозяйственного ведения (Продавец).

**Электронные торги состоятся 13.10.2025.**

**Лот № 1:** VOLKSWAGEN PASSAT
Кузов (рама) № WVWZZZ3CZAP045025.
Начальная цена с НДС 20 % – 10 898,53 руб.
Местонахождение: г. Минск, ул. Казинца, 103.
Извещение о проведении аукциона размещено
на сайте Государственного комитета по имуществу
Республики Беларусь gki.gov.by
и на электронной торговой площадке «GOSTORG»
(gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,
torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

# ЗАВАЯВАНАЯ ЯШЧЭ АДНА ВЯРШЫНЯ

## Арына САБАЛЕНКА абараніла тытул чэмпіёнкі US Open



Адна перамога на Адкрытым чэмпіянаце ЗША па тэнісе — добра, а дзве — лепш. Гэта даказала беларуская тэнісістка, першая ракетка планеты Арына Сабаленка. Другі год запар яна выйграла жаночы фінал аднаго з чатырох турніраў Вялікага шлема — US Open. Вырашальны матч у Нью-Ёрку яна правяла супраць амерыканскай тэнісісткі, дзявятай ракеткі свету Аманды Анісімавай. Адна гадзіна і 36 хвілін спатрэбілася Арыне, каб разабрацца з саперніцай і заваяваць тытул. Вынік сустрэчы — 6:3, 7:6.

**Свае віншаванні першай ракетцы свету накіраваў Прэзідэнт. «Дарагая Арына! Віншую з чарговай яркай перамогай на US Open. Дзякуючы сапраўднаму чэмпіёнскаму характару заваяваная яшчэ адна вялікая вяршыня. Перакананы, што на ўсіх кантынентах і ў любой краіне ты заўсёды адчуваеш гарачую падтрымку землякоў. Ганарымся табой і жадаем новых дасягненняў», — гаворыцца ў віншаванні.**

Цяпер у кар'еры Арыны Сабаленкі — чатыры вялікія шлема. У 2023 і 2024 гадах яна выйграла Australian Open, а ў 2024 і 2025 гадах — US Open. Гэта перамога ў Нью-Ёрку трывала замацавала тэнісістку на пазіцыі першай ракеткі свету. Цяпер у яе актыве больш за 11 тысяч ачкоў, а ў польскай тэнісісткі Ігі Швёнтак, якая займае другі радок, — больш за сем тысяч.

Перамога Арыны Сабаленкі паказала ўсяму свету, на што здольная беларуская школа тэніса. З тэнісісткай ужо даўно працуе беларускі трэнер Антон Дуброў, прадстаўнік беларускай трэнерскай дынастыі (яго дзед — Эдуард Дуброў — адзін з найлепшых трэнераў савецкага часу). Падчас падрыхтоўкі да фіналу US Open да трэнерскага штабу далучыўся і легенда айчыннага тэнісу — Максім Мірны. «Макс — новы голас у нашай камандзе, ён шмат аналізуе, дае свае парады. Ён вельмі моцна дапамог з многімі момантамі. Гэта была камандная праца. Пасля Уімблдона я ўзяла невялікую паўзу, а потым мы вярнуліся і шмат працавалі над памылкамі, над тэнісам, каб падысці ў лепшай форме. Узяць Макса было адным з правільных рашэнняў», — адзначала Арына Сабаленка на прэс-канферэнцыі.

Днём перад фіналам добрыя пажаданні тэнісістцы накіравалі выхаванцы СДЮШАР па тэнісе «Змена», дзе пачынала свой спартыўны шлях Арына Сабаленка. У сваё прамове на ўзнагароджанні Арына падзякавала роднай школе і прызналася, што гэта пажаданне надало ёй сіл. Беларускі тэніс, сапраўды, гучыць на ўвесь свет.

# ГЭТА БЫЛО ПРЫГОЖА І ГОДНА

## Біятланісты праверылі свае сілы ў Сочы

Новы біятлонны сезон афіцыйна адкрыты. У Сочы адбыўся першы этап Кубка Садружнасці 2025/2026. На ім біятланісты спаборнічаюць у фармаце летняга біятлона на лыжаролерах. Нашы спартсмены не падвялі і пачалі сезон з медалёў.

Лідар нацыянальнай зборнай Антон СМОЛЬСКІ выйграў гонку пераследу. На дыстанцыю 12,5 кіламетра беларускі біятланіст выходзіў трэцім з адставаннем ад лідара ў 17 секунд. Антон Смольскі адзін раз памыліўся на агнявым рубяжы, а па выніках другой стральбы лежачы вырваўся наперад. З дзесяці стрэлаў на стойцы Антон сапсаваў адзін, што не перашкодзіла яму захаваць першае месца. На фінішы ён амаль на хвіліну апярэдзіў расіяніна Мікіту Поршнева, тройку прызёраў замкнуў Алег Дамічак.

**З перамогай славутага біятланіста павіншаваў кіраўнік дзяржавы. «Антон, дзякуй! Было прыгожа і годна», — гаворыцца ў віншаванні.**

Таксама Антон Смольскі заняў трэцяе месца ў мужчынскім спрынце. На першым агнявым рубяжы ён дапусціў дзве памылкі, але ідэальна правёў стральбу на стойцы.



Трэці вынік паказалі Ксенія Варабей і Ірына Шаклеіна, якія выступалі ў жаночай адзіночнай эстафеце. Дзяўчаты большую частку гонкі трымаліся ў топ-5, на апошнюю перадачу эстафеты Варабей прыйшла чацвёртай, а на заключным этапе Шаклеіна падняла дуэт на трэцяе месца.

Бронзавыя медалі ў мужчынскай эстафеце заваявалі Сцяпан Данілаў і Максім Варабей. Біятланісты адразу захапілі лідарства ў гонцы і трымаліся яго аж да апошняга этапу. Але па выніках заключнай стральбы Данілаў апусціўся на трэці радок, на гэтай жа пазіцыі Сцяпан і фінішаваў.

Гэты сезон для біятланістаў — асаблівы. Алімпійскі. Праўда, ці выступяць нашы спартсмены на Алімпійскіх гульнях, дагэтуль невядома. Аднак апускаць рукі яны не прывыклі, таму працуюць на максімуме, каб у выпадку станоўчага рашэння быць падрыхтаванымі на выдатна. І першы старт сезона — не паказчык падрыхтоўкі каманды. Тым больш што старты летнія, усе спартсмены падыходзяць да іх у рознай форме. **Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Алег РЫЖАНКОЎ** расказаў парталу Sport5by, што ў Сочы наўмысна ўзялі і маладых спартсменаў — так званы «Састаў Б», — каб яны набраліся вопыту і праверылі свае сілы.

«Спартсмены па-рознаму рэагуюць на пачатак сезона. Зразумелая справа, першы старт, заўсёды ёсць нейкае чаканне, хочацца праверыць свой стан, якая форма ў спартсмена. Цяпер усе знаходзяцца ў рознай форме. Спаборніцтвы на лыжаролерах усё ж такі адрозніваюцца ад лыж, прычым глабальна. У плане экстрэмалізму, назавём гэта так, на ролерах любы нялоўкі рух на спуску можа прывесці да сур'ёзных траўм. Спартсмены, асабліва трэнерскі штаб, больш педантычна падыходзяць да гэтага пытання і дзесьці, можа быць, перастрахоўваюцца», — адзначыў Алег Рыжанкоў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота з адкрытых крыніц.**


### ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Саксэсфултрэйд Плюс»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 2406 | 1. Изолированное помещение с инв. № 500/D-708141018, площадь – 20,1 кв. м, назначение – Административное помещение, наименование – Административное помещение | г. Минск, ул. Монтажников, 9-92 | 250 000,00 | 25 000,00 | 12 500,00 |
| | 2. Изолированное помещение с инв. № 500/D-708141019, площадь – 18,1 кв. м, назначение – Административное помещение, наименование – Административное помещение | г. Минск, ул. Монтажников, 9-93 | | | |
| | 3. Изолированное помещение с инв. № 500 D-708141020, площадь – 18,7 кв. м, назначение – Административное помещение, наименование – Административное помещение | г. Минск, ул. Монтажников, 9-94 | | | |
| | 4. Изолированное помещение с инв. № 500 D-708141021, площадь – 17,7 кв. м, назначение – Административное помещение, наименование – Административное помещение | г. Минск, ул. Монтажников, 9-95 | | | |

В отношении лотов проводятся первые торги

**Ограничение (обременение):** изолированные помещения находятся в лизинговой собственности у ООО «Финансы и Механика» на основании договоров финансового лизинга по 15.07.2029

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **10 октября 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **с 10.00 9 сентября 2025 года до 16.00 8 октября 2025 года** |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту 2406, ООО «Саксэсфултрэйд Плюс», проводимых 10.10.2025.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лоту № 2406 – 5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов осуществляется согласно договору купли-продажи, но не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/. Дополнительная информация по предмету торгов – **по тел. +375293042560, Андрей.**

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375296822863 Сергей Николаевич (пн – пт с 9.00 до 17.00).**

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании действующего законодательства Республики Беларусь.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Саксэсфултрэйд Плюс» (220019, г. Минск, ул. Монтажников, д. 9, оф. 92) sergnig@gmail.com, тел. +375296822863** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» (220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127) ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# САМЫ МАСАВЫ ЗАБЕГ ГОДА І ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ЗНАЁМСТВАЎ



## Чым быў адметны юбілейны Мінскі паўмарафон

**Шчаслівыя ўсмешкі, 5 дыстанцый, 25 тысяч удзельнікаў. На вуліцы Кірава каля Нацыянальнага алімпійскага стадыёна «Дынама» ў нядзелю стартавала маштабная бегавая падзея — 10-ы Мінскі паўмарафон.**

Спаборніцтвы па традыцыі стартавалі з забегаў на самыя доўгія дыстанцыі 10,5 і 21,097 кіламетра. Амаль усе медалі (за выключэннем «бронзы» на 10,5 кіламетра) забралі беларускія спартсмены, а адначасна з імі львіную долю прызавога фонду. На гэтых трасах было нямала аматараў бегу. Усяго на Мінскім паўмарафоне — 2025 выступалі прадстаўнікі 15 краін, у тым ліку В'етнама, Філіпін, Ізраіля, Польшчы, Расіі і іншых. На розных дыстанцыях спрабавалі сілы блогеры, шоўмены, тытулаваныя спартсмены, кіраўнікі.

**Міністр спорту і турызму Беларусі Сяргей КАВАЛЬЧУК** — пастаянны ўдзельнік Мінскага паўмарафону. Ён спаборнічаў на дыстанцыі ў 5 кіламетраў. Кіраўнік спартыўнага ведамства расказаў, што сёлета шмат юбілейных дат: 80-годдзе Вялікай Перамогі, 30-годдзе Міністэрства спорту і турызму Беларусі, 20-годдзе Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, 10-годдзе Мінскага паўмарафону. «Яшчэ адзін важны момант: з гэтай бегавой падзеі пачынаецца святкаванне Дня Мінска. Забегі — гэта ядцанне спартыўнае, інфармацыйнае. Аматараў бегу ў краіне становіцца больш, і гэта падстава для гонару. Што датычыцца асабістых эмоцый, то не спяшаючыся пераадолеў 5 кіламетраў. Але зрабіў гэта хутчэй, чым летась», — прызнаўся Сяргей Кавальчук.

**Кіраўнік адміністрацыі Кастрычніцкага раёна сталіцы Эдуард ТАМІЛЬЧЫК** адзначыў, што не прапусціў ніводнага паўмарафону з 2015-га (за выключэннем адменнага ў 2020-м). Паводле яго слоў, такія старты дораць мноства станоўчых эмоцый. «Бег — гэта не толькі здароўе, але і зарад пазітыву, які дае жаданне актыўна працаваць на карысць Радзімы, развівацца ва ўсіх адносінах. Сам атрымліваю шчырае задавальненне ад удзелу ў паўмарафоне. Каб камфортна адчуваць сябе на дыстанцыі, бегаю кожную суботу па 5 кіламетраў», — адзначыў ён.



Маршрут Мінскага паўмарафону быў пракладзены па цэнтры сталіцы ўздоўж галоўных славутасцяў горада. Фінішавалі ўдзельнікі на бегавой дарожцы стадыёна «Дынама». Усяго на забег заявілася больш за 25 тысяч чалавек, рэгістрацыя на дыстанцыі завяршылася датэрмінова. «Мы маглі прыняць і большую колькасць аматараў бегу, але па даных мінулага года ўстанавілі ліміт, каб кожны адчуваў сябе камфортна. Самаму малодшаму ўдзельніку няма і года, а самаму старэйшаму — 95. Сёлета ў праграму быў дададзены фан-забег на 3 кіламетры для тых, хто толькі пачынае займацца бегам, — сказаў **кіраўнік Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Іван ЦІХАН.** — На фінішы ўсе ўдзельнікі атрымалі медалі, а найбольш крэатыўныя бегуны ў яркіх вобразах былі ўзнагароджаны спецыяльнымі падарункамі. Самым цікавым наватвядзеннем стаў праект «Палавінка на паўмарафоне»: свабодныя мужчыны і жанчыны маглі надзець спецыяльны бранзалет блакітнага ці ружовага колеру, які паказваў адкрытасць да знаёмства. Можа быць, ужо ў найбліжэйшай будучыні паўмарафон стане пляцоўкай для прызнанняў у каханні і стварэння сем'яў».

Навацыя — забег на 3 кіламетры для школьнікаў, студэнтаў, пенсіянераў і асоб з абмежаванымі магчымасцямі, які стаў самым масавым, сабраўшы 7 тысяч удзельнікаў. Эфектным атрымаўся і турнір, дзе людзі выступалі з сабакамі. «Самым эмацыянальным па традыцыі выйшаў дзіцячы забег. Колькі жадання ў дзяцей хутчэй завяршыць дыстанцыю, радасці за тое, што сам выйграў медаль. Гэты від праграмы — на перспектыву. Спачатку бацькі прыводзяць дзетак, а праз некаторы час яны ўжо будуць цягнуць мам і тат, рыхтавацца выступіць на большай дыстанцыі», — пракаментаваў Іван Ціхан.

Такім чынам, Мінскі паўмарафон не проста верасьнёўская нядзеля. Гэта час, калі сталіца жыла бегам і яго прадчуваннем. Сустрэчы і абдымкі, хваляванне і азарт каля стартавай аркі, мэтанакіраванасць і пераадоленне дыстанцый, эйфарыя на фінішы. Адчуванне свята і еднасці. І гонару за сваю краіну.

***

**Пераможцамі самай масавай дыстанцыі — 10,5 метра — сталі беларусы Мікіта Кацянёў і Ніна Савіна, а Уладзіслаў Прамаў і Таццяна Шабанава першымі фінішавалі на дыстанцыі 21,097 кіламетра.**






**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 90 %

| | |
|---|---|
| Организатор | ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1 |
| Продавец | ОАО «Труд», г. Гомель, ул. Советская, д. 39 |

**Аукцион состоится 24.09.2025 в 11.00**
по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28.
**Заявления на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 09.09.2025 по 22.09.2025 до 16.00** по указанному адресу.
**Организатор аукционных торгов:**
**☎ 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

**Предмет аукциона: ЛОТ № 1. Два изолированных помещения** (складское помещение с инв. № 350/D-246855, пл. **962,4 кв. м**, производственное помещение с инв. № 350/D-246852, пл. **330,5 кв. м,** **два капитальных строения (склад (ангар)** с инв. № 350/С-181548, пл. **521,0 кв. м**, здание административно-хозяйственное с инв. № 350/С-161164, пл. **26,0 кв. м,** **тепловая сеть** протяженностью **213,6 м, водопроводная сеть** протяженностью **89,4 м, канализационная сеть** протяженностью **149,2 м).**
**В состав лота входят:** ворота металлические (инв. № 12) 8,60 м, дорога асфальтированная (инв. № 029) 101 кв. м, забор деревянный с воротами (запасной вход) (инв. № 08) 157 кв. м, забор с воротами (инв. № 026), 132 м, навес (инв. № 09), яблоня /30 (инв. № 9026), яблоня /35 (инв. № 9022), яблоня /35 (инв. № 9023), яблоня /38 (инв. № 9024), яблоня /41 (инв. № 9020), яблоня /44 (инв. № 9021), яблоня /44 (инв. № 9025).
**Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, 2Б/1/2**

**Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000006000452** общей площадью **1,3847 га**

**Право постоянного пользования (доля в праве 1/1)**

**Целевое назначение земельного участка:** для эксплуатации производственных зданий

Подробный перечень изолированных помещений, капитальных строений, входящий в состав лота, размещен на сайте организатора аукциона https://ocenkaservis.by **(раздел Очные торги»)**

**Начальная цена с учетом НДС 20 %: 91 875,00 бел. руб.**

Задаток **5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с **Продавца (ОАО «Труд»):** Р/с BY11BLBB30120400062954001001 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, БИК BLBBBY2X, УНП 400062954, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса»

Размер шага составляет **5 (пять) процентов** от начальной цены лота

| | |
|---|---|
| Порядок ознакомления | В рабочие дни по предварительному согласованию **8 (044) 551-22-67** Пастарнаков Никита |

Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; оплатить **вознаграждение организатору в размере 7 % от цены продажи лота** в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона.
**Условия оплаты: оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента его подписания.**
Проводится аукцион в соответствии с Положением закрытого акционерного общества «Оценка Сервис» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 30.04.2025 г.
Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов: https://ocenkaservis.by **(раздел Очные торги»), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».**

**Организатор аукционных торгов:**
**☎ 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89. E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

З НАГОДЫ

# СЫРЫ, ЖЫВЫЯ СКУЛЬПТУРЫ І СПЕКТАКЛЬ ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ

## Як Гродна адзначыў Дзень горада

Сёлета гораду над Нёманам споўнілася 897 гадоў. Па традыцыі Дзень горада адзначалі ярка і маштабна. Усе мінулыя выхадныя тут панавала атмасфера сапраўднага свята, прайшлі канцэрты беларускіх зорак, ладзіліся інтэрактывы, фестывалі і выставы.







У пятніцу — напярэдадні святкавання — прайшло ўрачыстае ўскладанне кветак да брацкай магілы савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пасля на знакамітай «Алеі кіно» адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця памятнай пліты, прысвечанай фільму «Годны да нестраявой». Гэта ўжо чатырнаццаты аб'ект на ўнікальнай алеі, якая стала папулярным месцам як для гараджан, так і для турыстаў.

Яркім працягам свята стаў урачысты канцэрт, дзе найлепшыя кіраўнікі і супрацоўнікі гродзенскіх прадпрыемстваў і арганізацый атрымалі ганаровыя ўзнагароды і падзякі за ўнёсак у развіццё горада. Таксама былі абвешчаны тыя, чые імёны занесены ў Кнігу Славы. «Мы адзначаем выдатнае свята — Дзень горада. Я хачу павіншаваць усіх жыхароў з гэтым цудоўным днём і выказаць ім сваю падзяку за любоў да нашага агульнага дома, — адзначыў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Юрый КАРАЕЎ**. — Для мяне, як для чалавека, які пераехаў сюды 5 гадоў таму і ўжо пачаў адчуваць спакойную любоў да горада, гэты дзень асабліва значны. Я быў правяраючым, памочнікам, інспектарам, а цяпер я — жыхар Гродна. І мне вельмі прыемна бачыць, як горад мяняецца і развіваецца. Я хачу выказаць асаблівую ўдзячнасць усім, хто працаваў на яго, хто аднаўляў яго пасля разбурэнняў Вялікай Айчыннай вайны. Мы ўпэўнена ідзём да юбілею і паляпшаем гэта цудоўнае месца».

Да віншаванняў далучыўся і **старшыня Гродзенскага гарвыканкама Андрэй ХМЕЛЬ**: «Кожны з нас робіць свой унёсак у развіццё Гродна. Ці то новы дом, ці то зялёная алея, ці то зручны грамадскі транспарт або памятны знак — усё гэта вынік нашай агульнай працы. Я ганаруся нашымі грамадзянамі і іх стаўленнем да таго, што мы маем. Мы не толькі ствараем матэрыяльныя каштоўнасці, але і захоўваем традыцыі. Гэта тое, чым мы па праве можам ганарыцца і што перадаём нашым дзецям. Мы думаем не толькі пра сённяшні дзень, але і пра будучыню. Разам ствараем горад, у якім хочацца жыць і гадаваць дзяцей. Дзякуй вам за вашу працу і адданасць гораду».

Завяршылася насычаная пятніца фестывалем водных ліхтарыкаў. Праграма святкавання ў выхадныя была таксама вельмі багатая.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**
**Фота БелТА.**

**У суботу на плошчы Леніна адбылося ўрачыстае адкрыццё самага смачнага свята краіны — фестывалю сыру. На цырымоніі адкрыцця намеснік Прэм'ер-міністра Юрый ШУЛЕЙКА падкрэсліў, што харчовая бяспека краіны — неад'емная частка дзяржаўнай бяспекі: «Менавіта таму свята горада Гродна шмат гадоў крочыць побач з фестывалем сыру, які знайшоў прызнанне ў людзей. Сведчанне таму — вялікая колькасць гродзенцаў, гасцей горада і прадстаўнікоў прадпрыемстваў краіны, якія сабраліся тут сёння». На вядомых усёй краіне прадпрыемствах-флагманах фарміруецца львіная доля высакаякаснай прадукцыі, якая вырабляецца ў Беларусі, лічыць Юрый Шулейка: «У кожнага жыхара Беларусі ёсць свой густ, свае любімыя прадукты. Сам фестываль — гэта ўжо конкурс беларускіх сыраробаў, сыравараў, іх імя, іх гонар». Таксама намеснік Прэм'ер-міністра адзначыў велізарны турыстычны патэнцыял Гродна і Гродзеншчыны. Такія святы, фестывалі ў разы павялічваюць цікавасць да рэгіёна, ствараюць асаблівы імідж, прыцягваюць усё больш гасцей.**


Центр Промышленной Оценки

**• Организация аукционов • Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Сморгонский завод оптического станкостроения», Гродненская область, г. Сморгонь, ул. Якуба Коласа, д. 80, корпус 25, офис 302. УНП 500154362 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет аукциона (одним лотом)**
Адрес: **Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Якуба Коласа, 80**

**Помещения административного корпуса 25**
в составе:
**административные помещения 30,5 кв. м** (443/D-11064), **1675,5 кв. м** (443/D-11065), **777,9 кв. м** (443/D-11066, составные части и принадлежности: подвал, покрытие 2212,9 кв. м, подъездной путь 231,2 кв. м, лестница 130,6 кв. м, подпорная стена 51,0 кв. м, покрытие из плитки 747,5 кв. м, ограждения 9,10 м и 9,0 м), **17,7 кв. м** (443/D-11069), **1880 кв. м** (443/D-11070), **2569,8 кв. м** (443/D-11071); **ТП 75,2 кв. м** (443/D-11072); **конференц-зал 822,1 кв. м** (443/D-11067).
В состав лота входит **озеленение** (инв. № 2000078/12): многолетние насаждения (ель колючая голубая 1 шт., туя западная 14 шт., ива белая 3 шт., дерен белый 5 шт., арония черноплодная (живая изгородь) 187,0 м. п., дерен белый, спирея иволистная (живая изгородь) 95,0 м. п., туя западная 2 шт., туя западная шаровидная 3 шт., газон 0,25 га)

***Сведения о земельном участке:*** общ. пл. **1,0145** га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания здания административного корпуса 25. Ограничения (обременения): водоохранные зоны рек, водоемов; охранные зоны электрических сетей (пл. 0,0096 га)

***Обременения*:** в подвальном помещении здания расположено противорадиационное укрытие ПРУ, которое не входит в состав лота. После продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 2 522 424,59 бел. руб.**

**Задаток 2 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи.

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by). Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель торгов, либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере 2 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 10.10.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие принимаются по 09.10.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1, г. Минск, 220004. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Гр. РБ Рудой А.И. |

**Предмет электронных торгов**

**Пункт технического обслуживания (Здание специализированное иного назначения),**
инв. № 124/С-9503, общ. пл. 774.7 м$^2$,
по адресу: ***Брестская обл., Пружанский р-н, Пружанский с/с, 2/14*.**

Сост. части и прин-ти: кабельная линия протяженностью 325,8 м, водопроводные сети протяженностью 281,9 м. Сведения о земельном участке: общ. пл. 1,3175 га, предоставлен продавцу на праве аренды по 06.09.2033 для обслуживания приобретенного недвижимого имущества (капитальное строение 124/С-9503 (пункт технического обслуживания № 297)

**Начальная цена лота, без НДС – 122 045,81 бел. рублей**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях (BYN) на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **15 (пятнадцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 10.10.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **09.10.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ФЕСТЫВАЛІМ

# НАВУКА — СПРАВА НЯСУМНАЯ!

**6 верасня ў Цэнтральным батанічным садзе НАН Беларусі праходзіў фестываль навукі.**

На пляцоўках: «Космас», «Інтэлектуальныя тэхналогіі», «Смак навукі», «Медыцына», «Лабараторыя», «Экалогія», «100 інавацый маладых вучоных», «Універсітэт будучыні», «Навука 0+», «Атам Team» дзяцей і дарослых чакала паглыбленне ў свет навукі і новыя веды. І ўсё гэта — не сумныя лекцыі, а практычныя заняткі і навуковыя шоу. Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь прадставіла сваю традыцыйную тэматычную пляцоўку «Універсітэт будучыні». Пляцоўка аб'ядноўвае больш за 35 універсітэтаў краіны, Рэспубліканскі маладзёжны цэнтр і Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк.



Была магчымасць зносін з тымі, хто развівае розныя кірункі навукі, у тым ліку з першым касманаўтам у гісторыі суверэннай Беларусі Героем Беларусі Марынай Васілеўскай, расійскім касманаўтам Героем Расійскай Федэрацыі Алегам Навіцкім.

**Віктар ІВАНЧЫКАЎ, фота аўтара.**

СВЯТОЧНАЕ

# БУЛЬБЫ СТОЛЬКІ, ШТО ЯБЛЫКУ НЯМА ДЗЕ ЎПАСЦІ!

## У аграгарадку Дзешчанка прайшоў фестываль «Бульба-фэст»

**На выхадных у аграгарадку Дзешчанка Уздзенскага раёна прайшоў пяты юбілейны фестываль бульбы «Бульба-фэст». За час свайго існавання гэта свята стала сапраўднай візітнай карткай не толькі аграгарадка, але і ўсяго Уздзенскага раёна.**

Як паведаміла **намеснік старшыні Уздзенскага райвыканкама Анжэла ЖАНДАРМАВА,** гісторыя «Бульба-фэсту» бярэ свой пачатак з восеньскіх школьных кірмашоў, якія праводзіліся на працягу многіх гадоў у мясцовай школе: «Тут калісьці знаходзілася эксперыментальная база імя Суворава, спецыялісты якой вырошчвалі новыя насенныя сарты бульбы беларускай селекцыі. Цяпер пра гэтыя і не толькі факты можна даведацца, зазірнуўшы ў школу, дзе дзейнічае музей бульбы. А там ёсць на што паглядзець і чаму здзівіцца».

Асобная частка экспазіцыі — гэта гісторыя базы імя Суворава і дзейнасць яе кіраўніка Вадзіма Лойкі. У гады яго кіраўніцтва аграгарадок Дзешчанка лічыўся бульбяной сталіцай Беларусі. Адсюль асобныя сарты другога хлеба раз'язджаліся па гаспадарках усяго Савецкага Саюза. «Таму бульба заўсёды была здабыткам Дзешчанкі, а кірмашы, якія праводзіліся ў першыя выхадныя верасня, сталі сапраўднай падзеяй для мясцовых жыхароў. З кожным годам яны станавіліся ўсё больш папулярнымі, у рамках свята праводзіўся нават конкурс на лепшы помнік бульбе, дзе вучні разам з бацькамі і педагогамі стваралі арыгінальныя макеты з розных матэрыялаў. Ужо тады і з'явіліся першыя думкі, што было б выдатна, калі б у Дзешчанцы ўстанавілі памятны знак бульбе», — адзначыла Анжэла Жандармава.



Самы смачны фестываль Уздзеншчыны прайшоў ярка і маштабна. Гулянні даўно перараслі мясцовы фармат. Традыцыйна сюды з'язджаюцца людзі з усёй Беларусі, каб пачаставацца разнастайнымі стравамі з бульбы, адчуць атмасферу беларускага нацыянальнага каларыту. На імправізаваных падворках сталы ламаліся ад пачастункаў. Работнікі школ раёна прадставілі стравы ўсіх шасці абласцей нашай краіны. Зазываць паспрабаваць усё на смак не трэба было — перад дранікамі з грыбным соусам, камякамі з грыбамі, бабкай са шкваркамі, мучнымі блінамі, начыненымі бульбай, сырам і цыбуляй, міні-піцамі, бульбянымі вафлямі і іншымі далікатэсамі не выстаялі ні сытыя, ні тыя, хто на дыеце. А пірагі з бульбай Уздзенскага каледжа разышліся амаль адразу.

Інтэлектуальная ежа таксама карысталася попытам на фестывалі. Бібліятэкары з Узды арганізавалі хлебны рэйтынг, у якім любы жадаючы мог аддаць голас за любімы від хлеба. З цікавасцю знаёміліся наведвальнікі свята з выстаўкай літаратуры беларускіх пісьменнікаў, якія ў сваіх творах славілі хлеб. Асобную экспазіцыю прысвяцілі ганароваму жыхару Уздзеншчыны, ініцыятару «Бульба-фэсту» Вадзіму Лойку, аказаны гонар і іншым героям працы краю.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота ТК «Узда. Life».**

## 14.10.2025 года в 11.00 Светлогорский районный исполнительный комитет проводит открытый аукцион по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов

**Лот № 1:** готовностью 12 %, расположенного по адресу: г. Светлогорск, ул. Медковская, 53, на земельном участке площадью 0,0966 га и права аренды земельного участка сроком на 50 лет.

**Лот № 2:** готовностью 12 %, расположенного по адресу: г. Светлогорск, ул. Бобруйская, 16, на земельном участке площадью 0,0993 га и права аренды земельного участка сроком на 50 лет.

**Лот № 3:** готовностью 34 %, расположенного по адресу: г. Светлогорск, ул. Васильковая, 5, на земельном участке площадью 0,1027 га и права аренды земельного участка сроком на 50 лет.

**Аукцион состоится в зале заседаний райисполкома по адресу: г. Светлогорск, пл. Центральная, д. 1 (2-й этаж).**

| Номер лота | Назначение земельного участка | Начальная цена | Сумма задатка |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | 12873 руб. 19 коп. (в том числе 12223,55 руб. – начальная цена не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома, 649,64 руб. – начальная цена права аренды земельного участка сроком на 50 лет) | 2574,00 руб. |
| Лот № 2 | | 11260 руб. 71 коп. (в том числе 10230,47 руб. – начальная цена не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома, 1030,24 руб. – начальная цена права аренды земельного участка сроком на 50 лет) | 2252,00 руб. |
| Лот № 3 | | 22533 руб. 07 коп. (в том числе 20859,06 руб. – начальная цена не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома, 1674,01 руб. – начальная цена права аренды земельного участка сроком на 50 лет) | 4506,00 руб. |

Земельный участок по лотам № 1, № 2 и № 3 сервитутом не обременен.

**Условия предоставления земельного участка** по лотам № 1, № 2, № 3:

снятие, сохранение и использование плодородного слоя почвы согласно строительному проекту; соблюдение градостроительной документации, требований технических нормативных правовых актов; разработка проектно-сметной документации; сохранение существующего ландшафта; ведение проектирования и строительства с учетом градостроительных регламентов, природоохранных, санитарно-эпидемиологических требований, противопожарных, строительных и иных норм и правил при размещении жилого дома в сложившейся застройке; заключение с райисполкомом договора аренды земельного участка.

**Условия продажи:** Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона:

1. в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обязан:

1.1. возместить бывшему собственнику по лоту № 1 – 94,95 %, по лоту № 2 – 90,85 %, по лоту № 3 – 92,57 % от суммы, полученной от продажи единого предмета аукциона, за вычетом расходов на проведение публичных торгов и расходов на оценку не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома;

1.2. внести плату (часть платы – в случае предоставления Светлогорским районным исполнительным комитетом рассрочки внесения платы за право аренды земельного участка в установленном порядке) за предмет аукциона путем перечисления средств на счет главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Гомельской области № BY55AKBB36004290000160000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, BIC AKBBBY2X, УНП 400555165, фактический бенефициар – финансовый отдел Светлогорского райисполкома, УНП 400046849, код платежа 04002, за вычетом суммы, подлежащей возмещению бывшему собственнику;

1.3. возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оценку не завершенного строительством жилого дома, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, путем перечисления средств на расчетный счет Светлогорского райисполкома.

2. После совершения действий, указанных в пункте 1 настоящего извещения и предоставления в райисполком копий платежных документов, но не позднее 10 рабочих дней, заключить с райисполкомом договор аренды земельного участка.

3. В течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка, но не позднее 3 месяцев со дня получения выписки из решения Светлогорского районного исполнительного комитета о проведении аукциона и предоставлении земельного участка, победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок, изменения земельного участка на основании изменения целевого назначения земельного участка в Светлогорское бюро Речицкого филиала республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

4. Юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю в течение шести месяцев, а гражданину в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к его занятию в соответствии с целью и условиями его предоставления, в том числе получить в установленном порядке разрешительную документацию на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство одноквартирного жилого дома.

5. Завершить строительство одноквартирного жилого дома в сроки, установленные частью второй пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 87 «О некоторых мерах по сокращению не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач».

К участию в аукционе допускается: гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя), подавшее заявление на участие в аукционе и заключившее соглашение со Светлогорским райисполкомом, с приложением следующих документов:

документ, подтверждающий внесение задатка, с отметкой банка. Задаток перечислятся на расчетный счет райисполкома № BY27AKBB36044290020443200000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 400019707, Светлогорский райисполком; назначение платежа – задаток для участия в аукционе. Сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости единого предмета аукциона;

гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления об участии в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. Документы, составленные за пределами Республики Беларусь в соответствии с законодательством иностранного государства, должны быть легализованы, если иное не предусмотрено законодательством.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

**Документы для участия в торгах принимаются** по адресу: г. Светлогорск, пл. Центральная, 1, каб. 31 (3-й этаж, правое крыло), отдел экономики Светлогорского райисполкома с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням с даты опубликования извещения **до 09.10.2025 года включительно.** Заключительная регистрация в день аукциона с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Светлогорск, пл. Центральная, д. 1, каб. 31 (3-й этаж, правое крыло).

Телефоны: 8 (02342) 72065, 72365.

**Условия проведения аукциона** – наличие не менее двух участников. При наличии одного участника предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Порядок осмотра на местности земельных участков**: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220

КЛІМАТ

# НЕАДНАРОДНАЕ І ПРАХАЛОДНАЕ ЛЕТА

**У летнія месяцы месцамі назіраліся вельмі моцныя ліўні, нават град, памерам з яйка**

Нягледзячы на тое, што ліпень быў даволі гарачым, агульнае ўражанне ад лета ў нас засталося не самае радужнае. І гэтаму ёсць дакументальнае пацвярджэнне. Як паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, за летні сезон гэтага года сярэдняя па краіне тэмпература паветра склала плюс 17,8 °С, што на 0,2 градуса ніжэй за кліматычную норму.

## НАЙБОЛЬШ ХАЛОДНЫМ СЕЗОН БЫЎ У ЦЭНТРАЛЬНЫМ РЭГІЁНЕ

Кліматолагі Белгідрамета адзначаюць, што чэрвень у Беларусі быў даволі вільготным, а сярэдняя тэмпература паветра за ліпень была вышэй за кліматычную норму. Але не гэта галоўнае. Характэрна, што такім чынам перарываецца тэндэнцыя глабальнага пацяплення ў цёплы сезон. «Такіх і больш нізкіх сярэдніх тэмператур летняга сезона не назіралася з 2017 года», — паведамілі спецыялісты.

У цэлым за 90 дзён на большай частцы тэрыторыі адзначалася адмоўная анамалія тэмпературы паветра, яна знаходзіцца ў межах 0,1—0,5 °С. На некаторых станцыях Віцебскай, Гродзенскай,



Магілёўскай і Брэсцкай абласцей назіралася невялікая станоўчая анамалія. У абласным разрэзе найбольшыя значэнні адмоўных анамалій зафіксаваны ў Мінскай вобласці (0,4 °С), найменшыя — на тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай і Брэсцкай абласцей (у сярэднім па 0,1 °С), у Гродзенскай вобласці тэмпературны фон адпавядаў норме.

Кліматолагі падлічылі, што за мінулае лета адзначана ад 17 да 46 гарачых дзён (з тэмпературай паветра 25 °С і вышэй) пры норме 29—59 дзён і ад 1 да 10 вельмі гарачых дзён (з тэмпературай паветра 30 °С і вышэй) пры норме 1—13 дзён.

У гэтым сезоне максімальнага значэння (плюс 34,6 °С) тэмпература паветра дасягнула 3 ліпеня на станцыі Брэст, а мінімальная тэмпература паветра адзначана на станцыі Клічаў 28 жніўня, калі яна апускалася да 2,1 °С.

Асобна спецыялісты адзначаюць, што тэмпературны рэжым летняга сезона быў неаднародным: сярэдняя тэмпература чэрвеня і жніўня была ніжэй за норму на 0,4 і 0,9 °С адпаведна. Другі месяц лета быў са станоўчай анамаліяй, роўнай 0,9 °С.

## ЛІПЕНЬ БЫЎ І САПРАЎДЫ ГАРАЧЫМ, АЛЕ ТОЛЬКІ ЁН

Сярэдняя па Беларусі тэмпература паветра за чэрвень склала плюс 16,6 °С, што ніжэй за кліматычную норму на 0,4 °С. Надвор'е адрознівалася няўстойлівасцю і кантрастамі. Максімальнага значэння (плюс 31,7 °С) тэмпература паветра дасягнула 6 чэрвеня на станцыях Лельчыцы і Брагін. Мінімальная тэмпература паветра адзначана на станцыі Маларыта 23 чэрвеня — 3,9 °С.

Паводле інфармацыі кліматолагаў, сярэдняя тэмпература за ліпень склала 19,8 °С, што вышэй за кліматычную норму на 0,9 °С. Такі і больш цёплы ліпень бывае прыкладна раз у 7 гадоў. Максімальнага значэння (плюс 34,6 °С) тэмпература паветра дасягнула 3 ліпеня на станцыі Брэст. Мінімальная тэмпература паветра адзначана на станцыі Палеская 6 ліпеня — 6,9 °С. У асобныя суткі месцамі па краіне былі зарэгістраваныя трапічныя ночы (калі мінімальная тэмпература паветра складала 20 °С і больш).

Сярэдняя па Беларусі тэмпература паветра за жнівень склала 17,1 °С вышэй за нуль, што ніжэй за кліматычную норму на 0,9 градуса. Такіх і больш нізкіх сярэдніх месячных тэмператур у жніўні не адзначалася з 2009 года. Максімальнага значэння (плюс 33,3 °С) тэмпература паветра дасягнула днём 31 жніўня на станцыях Салігорск і Акцябр. Мінімальная тэмпература паветра адзначана на станцыі Клічаў 28 жніўня — 2,1 °С.

## ПЕРШЫЯ ДВА МЕСЯЦЫ — ДАЖДЖЫ

Сёлета за летні сезон у сярэднім па Беларусі выпала 259 міліметраў ападкаў, што складае 115 % кліматычнай нормы. На большай частцы тэрыторыі краіны выпала 100—130 % сезоннай нормы ападкаў. У абласным разрэзе найбольшая за сезон колькасць ападкаў выпала ў Мінскай вобласці — 295 міліметраў, або 127 % кліматычнай нормы. Найменшая колькасць ападкаў — у Брэсцкай вобласці: 219 міліметраў, або 100 % кліматычнай нормы.

На працягу сезона ападкі былі вельмі нераўнамерныя. У чэрвені і ліпені выпала 129 % і 144 % кліматычнай нормы адпаведна. У жніўні назіраўся недабор ападкаў (58 %).

За сезон было адзначана ад 27 да 43 дажджлівых дзён (з сумай ападкаў за суткі 2 міліметры і больш) пры норме 24—32 дні. Кліматолагі канстатавалі, што чэрвень быў вільготны. У сярэднім па краіне выпала 93 міліметры ападкаў, што склала 129 % кліматычнай нормы. Па краіне ападкі распаўсюджваліся нераўнамерна. На большай частцы тэрыторыі выпала 100—180 % ад нормы. У ліпені ў сярэднім выпала 129 міліметраў ападкаў, што склала 144 % кліматычнай нормы. Лішак адзначаўся на большай частцы тэрыторыі краіны. У жніўні ў сярэднім выпала 37 міліметраў ападкаў, што склала 58 % кліматычнай нормы. На ўсёй тэрыторыі, за выключэннем асобных пунктаў назірання Віцебскай і Гомельскай абласцей, адзначаўся недабор ападкаў.

На працягу сезона назіраліся туманы, навальніцы, адзначалася выпадзенне граду. Так, на станцыі Мар'іна Горка 5 чэрвеня быў зафіксаваны град дыяметрам 20 міліметраў. Дажджы ў асноўным насілі ліўневы характар, месцамі дасягалі крытэрыю небяспечнай з'явы. Адзначалася ўзмацненне хуткасці ветру з парывамі да 15 м/с і больш, у тым ліку шквалістае. Максімальная хуткасць ветру за летні сезон зарэгістравана на станцыі Магілёў 10 ліпеня — 26 метраў у секунду.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Надвор'е на заўтра

| | Ноч | Дзень |
|---|---|---|
| МІНСК 767 мм рт.сл. | +14..+15°С | +20..+23°С |
| ВІЦЕБСК 769 мм рт.сл. | +11..+13°С | +22..+23°С |
| МАГІЛЁЎ 763 мм рт.сл. | +14..+15°С | +22..+23°С |
| ГОМЕЛЬ 768 мм рт.сл. | +15..+16°С | +22..+24°С |
| ГРОДНА 764 мм рт.сл. | +13..+15°С | +21..+23°С |
| БРЭСТ 763 мм рт.сл. | +16..+20°С | +21..+23°С |

Паводле даных Белгідрамета

...у суседзяў

МАСКВА +20..+21°С

С.-ПЕЦЯРБУРГ +22..+24°С

**Месяц**

*Поўня 07.09.–13.09. Месяц у сузор'і Авена.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура



Фота Валянціны ДОЎНАР.

## 9 ВЕРАСНЯ — Даты. Падзеі. Людзі

**У краіне**

**1890** год — спектаклем «Злоба дня» М. Пацехіна ў Мінскім гарадскім тэатры адкрыўся першы тэатральны сезон.

**1940** год — нарадзілася Інеса Дзмітрыеўна Адзінцова, беларуская артыстка оперы. У 1966—1970 гг. — салістка Беларускай філармоніі, з 1970-га — выступала у Нацыянальным акадэмічным тэатры оперы Беларусі. Стварыла цікавыя сцэнічныя вобразы ў операх пераважна класічнага рэпертуару. Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу вакалістаў на найлепшую канцэртную праграму (1970).

**1945** год — нарадзіўся Віктар Іванавіч Валодзін, беларускі вучоны ў вобласці цеплатэхнікі, доктар тэхнічных навук (1999). У 1971 г. скончыў БДУ. Аўтар навуковых прац па даследаванні цеплавых і гідраўлічных працэсаў у цеплаабменных апаратах метадамі матэматычнага мадэлявання і вылічальнага эксперыменту, павышэнні энергаэфектыўнасці цепласпажывальных сістэм, інфармацыйным забеспячэнні энергазберажэння.

**У свеце**

**1585** год — нарадзіўся Арман Жан дзю Плесі дэ Рышэльe, французскі палітычны дзеяч, кардынал. З 1624 г. — кіраўнік каралеўскага савета, фактычны кіраўнік Францыі. Ажыццявіў рэканструкцыю Парыжа, якую пачаў з перабудовы ўніверсітэта Сарбоны; завяшчаў яму сваю багатую бібліятэку. Заснавальнік Французскай акадэміі.

**1790** год — нарадзіўся Сяргей Пятровіч Трубяцкой, князь, дзекабрыст, гвардзі палкоўнік. Адзін з арганізатараў «Саюза выратавання» (1816), «Саюза дабрабыту» (1818) і «Паўночнага таварыства» (1821). Удзельнік Айчыннай вайны 1812 г. і замежных паходаў 1813—1814 гг. Быў абраны дыктатарам паўстання, але, лічачы яго непадрыхтаваным, на Сенацкую плошчу 14 снежня 1825 г. не з'явіўся. Прысуджаны да смяротнага пакарання, замененага катаргай, якую адбываў у Забайкаллі.

**1930** год — нарадзілася Надзея Васільеўна Румянцава, расійская артыстка кіно, народная артыстка РСФСР. Працавала ў Тэатры-студыі кінаакцёра. Здымалася ў кіно. Яркая камедыйная здольнасць актрысы выявілася ў фільмах «Дзяўчаты», «Жаніцьба Бальзамінава» і інш.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 433. Індэкс 63850. Зак. № 1958.

Нумар падпісаны ў 19.30 8 верасня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12